Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Неыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрэсу ўнутраводнія	— 20 к.
іншасоюзныя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок шпальтэ тэксту	— р. 50 к.
За радок шпальтэ пасьлядоўнага тэксту	1 р. — к.
За радок шпальтэ перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьцепныя на 50 проц. дарожэй. Зьмена шрыфту бярэцца 10 проц. наверху.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 радок	35 коп.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрадоўж. і чарговыя публіка-	
за радок	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 286 (2474) Чацьвер, 13-га сьнежня 1928 г.

4-я сэсія ЦВК СССР.

ВЫБАРЫ Ў САВЕТЫ Ў 1928-29 Г.

Савецкая ўлада і ленінская партыя ня толькі АБАПІРАЮЦЦА на масы, але і ВЯДУЦЬ іх за сабою ў сацыялістычным будаўніцтве. У гэтым асноў..ая розьніца нашае выбарчае кампаніі ад буржуазных.

З дакладу т. Калініна.

МАСКВА, 12-XII. На вячэрнім пасяджэньні 11-га сьнежня сэсіі ЦВК заслухала даклад М. І. Калініна аб выбарах у саветы ў 1928-29 годзе.

Тав. Калінін, спатканы доўгімі воплескамі, пачынае свой даклад паведамленьнем аб тэй увазе, якую аддае перавыбарам у саветы заграничная белагвардзейская прэса. Мілюкоўская белагвардзейская газэта піша прыблізна так: «Чаго-ж гэта бальшавікі непакоіцца? Выбары ў іх, гэта ня выбары ў буржуазных дзяржавах. Асноўная расстаноўка сіл не зьмяняецца. Як і ўся ўлада, застаецца на пясцох тая-ж дыктатура пралетарыяту. Чаму-ж гэта бальшавікі надаюць такое вялікае значэньне сваім выбарам, зварачаюць такую ўвагу на іх арганізацыю»? Няганьнем аб савецкіх выбарах займаецца і, в дазволу сказаць «Социалистический Вестник". У адным з апошніх нумароў гэтае меншавіцкае газэткі стары правадыр меншавікоў Дан кажа: «Савецкія выбары, не зважаючы на палітычную манаполію кампартыі, сталі для яе самаю важнаю палітычнаю справаю». У гэтым артыкуле Дан гаворыць аб тым, што бальшавікі ўжываюць шмат захадаў для арганізацыі выбараў, для таго, каб «прамацаць настроі мас", для таго, каб „знайсьці ў іх спачуваньне».

Спыняючыся на гэтых двьюх ацэнках, т. Калінін зазначае, што абедзьве яны маюць не выпадковы характар. Вусьнамі мілюкоўцаў гаворыць іх парыжкіяя ідэалы. Буржуазныя групы бачаць у выбарах толькі бюлетэнь. На выбары самі яны ідуць не за тым, каб правесьці свае ідэалы (усё іх «ідэалы» —гэта толькі ўмацаваньне існуючага капіталістычнага становішча), ім трэба быць толькі абранымі. Кажучы, што савецкая ўлада шукае на выбарах спачуваньня мас, меншавікі да вядомае меры кажуць праўду. Мы ідём на выбары дзеля таго, каб знайсьці спачуваньне ў мас і дзеля таго, каб абапірацца на гэтыя масы. Але гэта толькі палова нашае задачы. Калі-б мы абмежаваліся толькі гэтым, дык мы-б па сутнасьці былі «явасьцістамі». Савецкая ўлада і кампартыя не таму толькі ідуць на выбары, каб шукаць спачуваньня мас, але каб панесьці ім свае ідэалы, імкненьні, каб штурхаць масы да будаўніцтва сацыялізму.

Выбарчая кампанія ў краі, у якім існуе дыктатура пралетарыяту, гэта той момант, калі мы, будаўнікі сацыялізму, сваю мэтавую ўстаноўку, свае ідэалы павінны шырока разгарнуць перад рабоча-сялянскімі масамі, калі мы павінны завалець гэтым масы. Гэта тая актыўная роля, якая не ўласьціва ні буржуазеі, ні рэфармістам, ні меншавікам. Кожныя выбары ў саветы даюць нам новы актыў працаўнікоў з гораду і вёскі. У шэрагі гэтага актыву ўступаюць беспартыйныя, уступаюць шырокія масы васковае беднаты, згуртоўваюцца шэрагі будаўнікоў сацыялізму. З гэтага пункту гледжэньня нашыя выбарчыя кампаніі маюць вялізнае значэньне і іх зусім нельга раўнаць з выбарчымі кампаніямі ў Заходняй Эўропе, ці Амэрыцы. Мы ня толькі абапіраемся на масы, але і вядзём іх за сабою. Мы будуем сацыялізм, які адхіляе капіталізм.

Спыняючыся на задачах, якія стаяць перад савецкаю ўладаю на вёсцы, тав. Калінін зазначае, што перад намі стаіць сур'ёзная задача перавесьці ўсю сялянскую масу на новыя рэйкі сацыялістычнага будаўніцтва. Сёлета савецкі ўрад асигнаваў 70 міліёнаў р. на арганізацыю савецкіх гаспадарак. Калі-б такая задача стояла перад Фордам, дык ён скупіў-бы лепшыя кавалкі зямлі. Савецкі ўрад, арганізуючы савецкія гаспадаркі, ухваліў браць пад іх зямлю, не занятую сялянствам. Савецкі ўрад бярэ пад увагу інтарэсы мас, ён ахоўвае і аберагае іх.

Зварачаючыся да груповак на вёсцы, т. Калінін адзначае, што барацьба з кулацтвам павінна быць ня толькі матар'яльнаю, але і ідэалёгічнаю. Ня трэба забываць, што кулак грае на вёсцы таксама свайго роду станоўчую ролю. Справа ня ў тым, каб раскулачыць кулака. Гэта справа простая. Але сёньня вы яго раскулачылі, а заўтра зьявіцца новы кулак: яны растуць, як шампіньёны на добра ўгноенай глебе. Трэба змагацца з самаю глебаю, на якой расьце кулак. Тую станоўчую ролю, якую можа выконваць кулак, павінна ўзяць на сябе кааперацыя. Яе праца павінна быць ня толькі гаспадарчаю, але і культурна-асьветнаю.

Тав. Калінін апавядае аб тым, як да яго адночы прышла сялянка,—старшыня сельсавету і апавядала, як яна два гады змагаецца з кулаком. Адносіны між імі далікатныя. Яны «на вы» і называюць адзін другога па імені і пабацьку. А барацьба ідзе упартая, суровая, але—барацьба эканамічная. Сельсавет—мае цагельню, і кулак таксама. Уся вёска падзялілася на дзьве часткі—хто за кулака, хто за сельсавет. І сельсавет упарта вядзе сваю лінію, бярэ цаною і якасьцю. Вось гэта сапраўдная глыбокая клясавая барацьба. Такую барацьбу з кулаком павінна павесьці і кааперацыя, у якое ёсьць вялікія сілы—лепшыя сілы нашага сялянства—і вялікія сродкі. Вялікую ўвагу на гэты фронт клясавае барацьбы павінен зьвярнуць і наш друк.

Зварачаючыся да надыходзячых выбараў, т. Калінін зазначае, што, маркуючы водлуг першых даных, яны будуць мець больш жвавы характар, чымся мінулыя. Асабліва жвавую будзе барацьба ўнутры саміх сялянскіх мас. У часе выбарчае кампаніі трэба весьці самую бязьлітасную самакрытыку, трэба шырока абмяркоўваць усе нашыя недахопы і памылкі. Гэта—выбарчая кампанія выключнае значнасьці. Гэта—палітычнае сьвята для ўсяго Саюзу. Ад нафтавых вышкаў Сахаліну да цытадэлі Абхазіі ўвагу рабочых і сялян у гэтую кампанію мы можам накіраваць на агульна-саюзныя мэты. Адно толькі гэтае гаворыць аб патрэбе ў часе выбарчае кампаніі аддаць ёй выключную ўвагу і энэргію ўсіх савецкіх і партыйных працаўнікоў. (Доўгія воплескі).

Абмен думкамі па дакладу т. Калініна.

Паасобным галасаваньнем Саюзнага Савету і Савету Нацыянальнасьцяў пастаноўлена весьці спрэчкі па дакладу т. М. І. Калініна ва супольным пасяджэньні абедзьвюх палат.

Першым выступае т. ЯН ПАЛУЯН (РСФСР). Зазначыўшы на дасягненьні мінулае выбарчае кампаніі, т. Палуян гаворыць, што гэтыя дасягненьні трэба замацаваць у працягу сучасных выбараў, імкнучыся яшчэ больш уцягнуць у кампанію шырокія масы рабочых і сялян. Вялікае ўвагі заслугоўвае пытаньне аб уцягваньні жанчын у кампанію. У мінулую кампанію ў сельскіх выбарах удзельнічала ўсяго толькі каля адная трэці жанчын-выбаршчыц, у гарадох-жа—каля 50 проц. Трэба ўжыць захады да больш актыўнага ўдзелу жанчын у выбарах.

Прадстаўніца УССР т. СТЭФАНОВІЧ кажа аб арганізацыі выбараў на сяле. Яна адзначае недахопы ў арганізацыі гэтае кампаніі — супаданьні з іншымі кампаніямі, недахопе будынкаў для выбарчых сходаў і г. д. Сваю прамову т. Стэфановіч гаворыць на украінскай мове.

Перавыбарчая кампанія, гаворыць т. ЛАСЕНКО (Украіна),—звычайна праводзіцца побач з абвастраньнем клясавае барацьбы, асабліва на вёсцы. Факты сёлетняе кампаніі сьведчаць, што сёлета барацьба гэтая будзе яшчэ больш абвостранаю. Амаль усюды адзначаецца асаблівая арганізаванасьць і актыўнасьць з боку кулакоў, якія імкнуцца прыцягнуць на свой бок серадняка і паралізаваць актыўнасьць беднаты. У некаторых прыгранічных мясцовасьцях Украіны кулакі зьвяжаюцца нават з пэўнымі закардоннымі элементамі. Адчуваючы бязвыхаднасьць свайго становішча, кулакі пераходзяць да простага тэрору, забіваючы актыўных васковых працаўнікоў. Неабходна гэтай актыўнасьці кулака, які робіць апошнюю стаўку на захоп упляву ў сельсаветах, процістаўіць магутную арганізаванасьць і актыўнасьць беднаты і серадняцтва. Побач з мабілізацыяй проці кулацтва ўсяе савецкае грамадзкасьці, належыць таксама ў адказ на кулацкі тэрор узмацніць і судова-карныя меры проці тых элементаў, якія хочуць сарваць нашу працу.

* * *

На ранішнім пасяджэньні 12 сьнежня будуць працягвацца спрэчкі па дакладу т. Калініна. На вячэрнім пасяджэньні мяркуецца заслухаць заключнае слова т. Калініна і даклады т.т. Якаўлева і Кубяка аб павялічэньні ўраджайнасьці сельскае гаспадаркі.

НЯ ВЕРЫЦЬ „МІРНЫМ" ЗАПЭЎНЕНЬНЯМ ІМПЭРЫЯЛІСТАЎ.

ВЫКРЫВАЦЬ ПЕРАД СУСЬВЕТНЫМ ПРАЛЕТАРЫЯТАМ САПРАЎДНЫ СТАН РЭЧАЎ І ЎМАЦОЎВАЦЬ АБАРОНЧУЮ МОЦ СССР—ВОСЬ НАШЫЯ ЗАДАЧЫ.

Голас дэлегатаў 4-е сэсіі ЦВК.

МАСКВА, 12-XII. У спрэчках па дакладу т. Літвінава на сэсіі ЦВК 10-га сьнежня выступіў т. ЛАРЫН.

Тав. Літвінаў агаласіў заяву Пуанкарэ аб тым,—кажа т. Ларын,—што ў выпадку сапраўднае гатоўнасьці нашага краю да разброеньня Пуанкарэ гатоў чуць ня сёньня разброіць войска сучаснае капіталістычнае Францыі. Цана такіх заяў павот тады, калі яны надрукаваны на аркушы паперы, залежыць не ад якасьці заяў, а толькі ад якасьці паперы (воплескі). Таму я раджу нашаму ўраду не асабліва даверліва адносіцца да гэтае заявы, ня вельмі клапаціцца ў сучасны момант аб тым, у якім парадку мы будзем разбройваць і дэмабілізоваць нашую Чырвоную армію, калі «ўрад Пуанкарэ» пойдзе нам насустрэч, а галоўную сваю ўвагу згуртаваць пакуль-што на выкрываньні перад тварам працоўных усяго сьвету сапраўднага становішча рэчаў і на ўмацаваньні нашае абарончае сілы.

Выступіўшы т. ПАРАЙКА гаворыць: «За апошні час мы мелі шмат анты-савецкіх выступленьняў, якія сьведчаць, што трэба быць гатовымі да рознага роду нечаканасьцяў». Тав. Парайка зазначае на жвавую анты-савецкую дзейнасьць, т. зв. украінскага ўраду, які вандруе да гэтае пары па тэрыторыі Польшчы, і пытаецца, ці не разыходзяцца такога парадку ўчынкі з тым усаворам, які існуе між СССР і Польшчай.

Далей выступае т. ЭЛЯВА, які падкрэсьлівае, што народы усяго Савецкага Саюзу вядуць вялічэзную, нячуваную ў гісторыі чалавецтва барацьбу і працу сацыялістычнага будаўніцтва, прычым упяршыню ранейшыя калёніяльныя і паўкалёніяльныя народы будуюць свае жыцьцё самастойна. Элява гаворыць: працоўныя Саюзу ўчынілі-б вялікае здачынства, калі-б дапусьцілі магчымасьць нападу на наш край і перапынак хоць-бы на адзін момант у нашым сацыялістычным будаўніцтве; рабочыя і сяляне адзінаю і моцнаю сьцяною спаткаюць усіх, хто наважыцца замахнуцца на іх волю і незалежнасьць.

Закулісны торг у Лугано.

ЧЭМБЭРЛЕН ІМКНЕЦЦА ЎЦЯГНУЦЬ НЯМЕЧЧЫНУ Ў АНТЫСАВЕЦКІ БЛЁК.

Савецкі праэкт скарачэньня ўзброеньняў адцягваецца на разгляд лютаўскай сэсіі.

Чэмбэрлен спакушае Штрэзэмана.

БЭРЛІН, 11-XII. Спасылаючыся на аўтарытэтныя крыніцы, „Кельнішэ Цэйтунг" піша, што Чэмбэрлен намеран у Лугано зьвязаць пытаньне аб эвакуацыі Рэйнскае вобласьці з праблемаю савецка-нямецкіх дачыненьняў. Водлуг слоў газэты, Чэмбэрлен хоча паставіць эвакуацыю Рэйнскае вобласьці ў залежнасьць ад гатоўнасьці Нямеччыны ў той ці іншай меры спыніць свае зносіны з СССР. У пацьверджаньне гэтага «Кельнішэ Цэйтунг» зазначае на падарожжа Літвінаў-Сідзкага ў Румынію, на падарожжа францускага генэрала Лерона ў Бухарэст і Варшаву, пасрэдніцкія спробы Польшчы ў спрэчках між Румыніяй і Вэнгрыяй і г. д.

«Такім парадкам,—піша газэта,—Чэмбэрлен хоча паставіць Нямеччыну перад дылемаю. Але Нямеччына ня мае ніякіх падстаў згадзіцца на такую пастаноўку пытаньня. Прапанова купіць Рэйнскую вобласьць коштам разрыву з Расеяй у такой самай меры не падлягае разгляду, як і прапанова заплаціць за Рэйнскую вобласьць новымі пастаянными кантрольнымі органамі і новым фінансавым цяжарам».

СПАТКАНЬНЕ ШТРЭЗЭМАНА І ЧЭМБЭРЛЕНА.

ЛУГАНО, 11-XII. Водлуг вестак нямецкіх колаў, у гутарцы, якая адбылася ў панядзелак між Штрэзэманам і Чэмбэрленам, былі закранутыя буйныя палітычныя пытаньні.

Тайныя перамовы аб эвакуацыі Рэйну.

ЛУГАНО, 11-XII. ЧЭМБЭРЛЕН заявіў прадстаўнікам ангельскага друку, што ў Лугано ня будзе ніякіх сэнсацый, і што разгляд рэпарацыйнага пытаньня ў сутнасьці зьяўляецца справаю міністраў фінансаў, якіх у Лугано няма, а ня прысутных тут міністраў замежных спраў.

У гутарцы з прадстаўнікамі нямецкага друку ШТРЭЗЭМАН устрымаўся ад заяў па сутнасьці, зазначыўшы, што ён умовіўся з Брыянам трымаць у тайне перамовы і адхіляў чуткі, нібыта ў размове з Брыянам ён узьнімаў пытаньне наконт зьместу англа-францускае згоды.

У гутарцы з прадстаўнікамі францускага друку БРЫЯН падкрэсьліў, што перамовы між міністрамі замежных спраў у Лугано маюць на мэце не адшуканьне новых выратаваньняў, а ажыцьцяўленьне пастаноў, ухваленых у Жэневе ў верасьні.

Амэрыка гатова да супрацоўніцтва з Нямеччынаю

БЭРЛІН, 11-XII. Вашынгтонскі карэспандэнт «Бэрлінэр Тагеблят», спасылаючыся на весткі з асьведомленых крыніц, паведамляе, што палітычныя колы Злучаных Штатаў вельмі здаволены тым насьпяючым уражаньнем, якое выклікана ў Нямеччыне палітыкаю Чэмбэрлена ў пытаньні аб Рэйнскай вобласьці. Гэтыя колы лічаць, што ў выніку такіх уражаньняў перад Нямеччынаю можа паўстаць пытаньне новага напрамку ня замежнае палітыкі, разьлічанага на сусьветны абхват. Погляд вашынгтонскіх колаў такі: Нямеччына не павінна дапушчаць, каб яе ўцягнулі ў адзіны фронт заходня-эўрапейскіх дзяржаў, які процістаўляецца Злучаным Штатам; шчыльнае супрацоўніцтва Нямеччыны са Злучанымі Штатамі магло-б адчыніць шмат шырокіх перспектыў, ня кажучы ўжо аб тым, што Нямеччына можа адыграць ролю маста між Злучанымі Штатамі і СССР.

Справа разброеньня зацягваецца.

ЛУГАНО, 11-XII. У аварацe Лігі Нацый пацьвярджаюць, што пытаньне аб часе скліку падрыхтоўчае камісіі да канферэнцыі аб разброеньні і чарговых яе двух сэсій зьяўляецца тэмаю абмеркаваньня на перамовах між дзяржавамі. Ва ўзнёмі разе, на парадак дню лютаўскае сэсіі будзе паставлен савецкі праэкт аб частковым разброеньні і прапановы прадстаўніка Нямеччыны Бэрнсдорфа аб справаздачнасьці наконт становішча ўзброеньняў.

Чаму ня склікана камісія аб разброеньні?

Ліст тав. Літвінава да Ляудона.

МАСКВА, 11. Часова выконваючы абавязкі наркома замежных спраў і старшыня далегацыі СССР у падрыхтоўчай камісіі канферэнцыі аб разброеньні тав. Літвінаў 5 сьнежня паслаў Ляудону старшыні падрыхтоўчай камісіі канферэнцыі аб разброеньні—ліст, у якім гаворыцца:

У лісьце ад 20 жніўня, спасылаючыся на рэзалюцыю пятае сэсіі падрыхтоўчае камісіі канферэнцыі аб разброеньні, якая ўхваліла скліканьне камісіі на новую сэсію «калі магчыма да будучага агульнага сходу», я пытаюся наконт тых прычын, якія перашкодзілі скліку падрыхтоўчай камісіі ў вызначаны тэрмін, і калі гэты склік праэктуецца.

У вашым адказе ад 5 верасьня, вы коратка паведамілі мяне, што, паводле вашай думкі, склік падрыхтоўчай камісіі да агульнага сходу Лігі Нацый ня даў-бы пажаданых вынікаў.

Па пытаньні аб перспэктывах скліку камісіі вы адказалі, што належыць сачыць за падзеямі, якія разгортваюцца на агульным сходзе Лігі Нацый, па зазначаньні якога вы зможаце прыняць рашэньне.

Мне вядома, што агульны сход Лігі Нацый ухваліў па пытаньні аб разброеньні падта неакрэсьленую рэзалюцыю, якая ўскладае на старшыню падрыхтоўчай камісіі паўтрыманьне кантакту з зацікаўленымі ўрадамі, каб ведаць аб стане перагавораў і мець магчымасьць скліканьне камісіі ў канцы бягучага году, а ў кожным выпадку ў пачатку 1929 г.

Такім чынам склік наступнай сэсіі камісіі вось быў пастаўлен у залежнасьць ад выніку дыпляматычных перагавораў паміж пакальнымі дзяржавамі.

На апошняй сэсіі камісіі,—гаворыцца далей у лісьце,—савецкая далегацыя рашуча супярэчыла супроць абгаварэньня гэтага пытаньня пры дапамозе дыпляматычных перагавораў пакальнай групы дзяржаў. Савецкая далегацыя выказала тады сумненьне аб магчымасьці выпрацоўкі такім шляхам базы для згоды разброеньня, якая-б была ўсім прынята.

Прымушан у сучасны момант канстатаваць, што небясьпека савецкай далегацыі поўнасьцю, нажаль, спраўдалася. Паколькі можна меркаваць, паводле апублікаваных афіцыйных дакумэнтаў, перагаворы, якія вяліся наконт скарачэньня ўзброеньняў паміж Англіяй і Францыяй, паперадзілі вядучу, затрудніўшы далейшую работу падрыхтоўчай камісіі. Яка-б там ні былі канкрэтныя перспэктывы работ камісіі, падрыхтоўчая камісія, на думку савецкай далегацыі, павінна зараз-жа сабрацца хоць-бы для таго, каб прааналізаваць прычыны непасьпяховасьці яе работы, зрабіць патрэбныя вывады з таго становішча, якое ўтварылася і зайсьці новыя шляхі для вырашэньня тых задач, што стаяць перад камісіяй. Сумныя вынікі перагавораў аб разброеньні паміж пакальнымі дзяржавамі тлумачацца ня толькі тым, што перагаворы вяліся нягласна і а неважаны былі мінімальнаю колькасьцю ўдзельнікаў, а таксама і тым прынцыпам індывідуальнага ўстанаўленьня межаў узброеньняў для кожнай краіны ў паасобку без якога-небудзь агульнага, справядлівага і для ўсіх прымальнага крытэрыя.

На неабходнасьць скарачэньня ўзброеньняў савецкая далегацыя зазначала з самага пачатку свайго ўдзелу ў падрыхтоўчай камісіі, апаведна з чым яна і ўнесла на гэтай сэсіі камісіі на разбраеньні свой праэкт аб скарачэньні ўзброеньняў (г. значыць скарачэньня на 50 проц.) з некаторымі адступленьнямі на карысьць слабейшых дзяржаў.

Я перакананы, што калі камісія не кадзе прызнаць кампетэнтнасьць сваё поўнае бяссільле ў справе стымулявання разброеньняў, дык яна павінна прыступіць да хутчэйшага разгляду падданага савецкай далегацыяй праэкту скарачэньня ўзброеньняў.

Таму прасіў-бы вас не адмовіць запрашаваць усіх удзельнікам падрыхтоўчай камісіі паклапаціцца атрымаць звычасна інструкцыі ад сваіх урадаў, маючы на ўвазе пастаноўку гэтага праэкту на парадак дня наступнай сэсіі камісіі. Мае прапановы зводзяцца да хутчэйшага скліку 6-сэсіі падрыхтоўчае камісіі і ўжыва патрэбных мер для пастаноўкі на абгавор гэтай сэсіі савецкага праэкту аб скарачэньні ўзброеньняў.

Правадыры Гаміндану ня ўпэўнены ў масах

НАЗНАЧЭНЬСТВА ПАЛОВЫ ДЭЛЕГАТАЎ НА ГАМІНДАНАЎСКІ ЗЬЕЗД.

ШАНХАЙ, 11-XII. У зьвязку з пратестам шмат-ліх мясцовых арганізацый Гаміндану проці пастановы выканкому назначыць палову дэлегатаў на надыходзячы зьезд Гаміндану, выканком ухваліў новы парадак выбараў дэлегатаў. Жадаючы забясьпечыць за сабою большасьць на надыходзячым зьезьдзе, выканком ухваліў, што 1) усе канчаткова афармленыя правінцыйныя аддзелы партыі маюць права выбару дэлегатаў; 2) правінцыйныя аддзелы партыі, якія знаходзяцца ў працэсе афармленьня, маюць права выбару дэлегатаў з ліку асоб, паказаных выканкомам, або абіраюць групу асоб, з якіх выканком сам назначыць дэлегатаў; 3) для тых аддзелаў, якія яшчэ ня складзены, дэлегаты назначаюцца выканкомам.

Агенцтва Рэйтэра наконт гэтага паведамленьня заўважае, што калісьці большасьць аддзелаў не зьяўляецца „канчаткова афармленымі" в прычыны немагчымасьці скончыць афармленьне іх да назначанага часу, дык гэтая пастанова дае магчымасьць кансэрватыўным лідэрам партыі назначыць на меншу паловы дэлегатаў.

АНГЛА-КІТАЙСКІЯ ПЕРАМОВЫ.

ШАНХАЙ, 11-XII. Сёньня адбылася першая гутарка ангельскага пасланьніка ў Кітаі Майльса Лемпсона з міністрам замежных спраў нацыянальнага ўраду Ван-Чжэн-Цінам. Водлуг вестак з японскіх крыніц, Лемпсон дамагаўся разгляду толькі пытаньне аб новых мытных тарыфах. Аднак, Ван-Чжэн-Цін патрабаваў разгляду ўсіх англа-кітайскіх пытаньняў адразу.

Як паведамляе агенцтва Рэйтэра, бакі абмяняліся праэктамі згоды аб тарыфах.

АМЭРЫКАНЦЫ—ЭКАНАМ. ДАРАДЧЫКІ КІТАЮ.

НЬЮ-ЁРК, 11-XII. У друку агалошана паведамленьне нанкінскага агенцтва, што 4 амэрыканцы згадзіліся на прапанову ўзяць на сябе абавязкі эканамічных дарадчыкаў Кітаю.

БАЙКОТ ЯПОНІІ.

ПЕКІН, 11-XII. Цзянцзынзінская арганізацыя Гаміндану паведаміла мясцовую антыяпонскую асацыяцыю аб сваёй пастанове забараніць вываз рагатае жывёлы і сельска-гаспадарчых прадуктаў у Японію.

АСАДНІЦТВА ДЭМАБІЛІЗАВАНЫХ У СЭЙЛУНЦЗЯНСКАЙ ПРАВІНЦЫІ.

ХАРБІН, 11-XII. Друк паведамляе, што мукденская ўлада выдае 30 міліёнаў даляраў на заселеньне прымоўнае з СССР Сэйлунцзянскае правінцыі, Салмунскага раёну. Плян заселеньня раёну разьлічан на 3 гады. Пераселеньні вядуцца з дэмабілізаваных салдат. Згодна плану, у першы год пераселяецца 20 тысяч чалавек.

Паўстаньне калёній проці сваіх прыгнятацеляў.

АНГЕЛЬСКАЯ ПРАВАКАЦЫЯ Ў АРАВІІ.—У МАРОКА ІЗНОЎ НЕСПАКОЙНА.—БАЙКОТ НЯ ТОЛЬКІ КАМІСІІ САЙМОНА, АЛЕ І КАПІТУЛЯНТАЎ З ІНДУСКАГА ЛЯГЕРУ.

ЛЁНДАН, 11-XII. Як паведамляе «Юнайтэд Прэс» з Эрузалему, два моцных пляменьні паўночнага Неджду ўзьнялі паўстаньне проці карали Неджду і Геджасу Іби-Савуда. Ангельскія паветраныя сілы і панцырнікі ў Амане (Транс-Ёрданія) знаходзяцца на баявой пагатове. Водлуг вестак агенцтва, паўстанцы захапілі Джэдду, галоўны порт Геджасу на Красным моры, і заснавалі там сваю базу.

У палітычных колах зазначаюць, што з самага разрыву перамоў між Англіяй і Іби-Савудам сталі зьяўляцца розныя чуткі аб насьпяваючых непакоях у Аравіі.

* * *

ЛЁНДАН. У знак пратэсту проці гвалтоўных учынкаў паліцыі пры разгоне ўдзельнікаў дэманстрацыі проці камісіі Саймона ў Лягоры і Люкнаў, Матылял Нэру агаласіў адозву да ўсяго нацыянальнага друку з прапановаю ўстрымацца ад далейшых паведамленьняў пра дзейнасьць камісіі Саймона. Апроч таго, Нэру патрабуе грамадзкага байкоту ўсіх тых хто ўдзельнічаў у нападзе на дэманстрантаў. Пры гэтым ён заўважае, што ўсе, хто супрацоўнічае з камісіяй Саймона, будуць таксама байкатавацца.

* * *

ПАРЫЖ, 11-12. Агенцтва Гаваса паведамляе: «Водлуг вестак, атрыманых «Тан» з Орану (французкая паўночная Афрыка), паўстанцы напалі на поўдзень ад Калёмбэшару (Марока) на 3 французкія вайсковыя аўтамабілі з французкімі афіцэрамі, якія рабілі інспэкцыйнае падарожжа. Забіт палкоўнік, паранена два афіцэры і трое салдат, адзін салдат прапаў неведома дзе».

Працоўныя Эльзасу ажабрачаны,

ЗАТОЕ ДОБРА ЖЫВЕЦЦА ФАБРЫКАНТАМ І КСЯНДЗАМ.

ПАРЫЖ, 12-XII. Пры пераходзе палаты да абмеркаваньня бюджэту Эльзас Лётарынгіі Грумбах ад імя сацыялістаў і Рышар ад імя радыкалаў заявілі, што, каб паскорыць праход бюджэту, яны адмаўляюцца ад выступленьняў. Выступіўшы потым камуніст Барон заявіў, што, наперакор заверэньням Пуанкарэ, а таксама францускіх і нямецкіх сацыялістаў, Эльзас пры бясспрэчнай эканамічнай актыўнасьці ўсё-ж перажывае цяжкі крызіс. Адначасна з вялікімі прыбыткамі прадпрыемцаў заработак ня толькі адстае ад росту прыбытку, але нават ніжэй, чымся ў 1913 годзе і чымся ўзровень яго ў іншых месцах Францыі. Зразумела, што пры такіх умовах капіталісты Эльзасу зьяўляюцца большымі пэрасьтатамі Францыі, чымся рабочыя. Больш таго, рабочыя Эльзасу пазбаўляліся тых пэнсій, для якіх рабіліся адлікі ў шэрынд прыналежнасьці Эльзасу да Нямеччыны. Што датычыць рэлігійнага пытаньня, дык у Эльзасе яно грае галоўную ролю. Урад Пуанкарэ пазьлічыў, у выбарчых мэтах, пэнсіі эльзаскаму духоўніцтву ў два разы, не асігнаваўшы разам з тым нічога гаспадыму ў пэнсіі рабочым і сялянам. Такая палітыка толькі ўзмацнае эканамічны рух.

У Саюзе ССР.

Перавыбарчая кампанія на Украіне.

ХАРКАЎ, 12-XII. Рабочыя Шэсьцінскага заводу на Кіеўшчыне дружна адгукнуліся на заклік узяць удзел у перавыборах саветаў. Рабочыя заснуюць спэцыяльныя брыгады, якія будуць абслугоўваць 5 вёсак. Арганізавана таксама брыгада для выезду на вёску з рабочых мэханічнага заводу. Прыклад кіеўскіх рабочых пераняў рабочыя цукраварняў і чыгуначнікі станцыі Бахмач, якія ўжываюць захады да ажыўленьня перавыбарчае працы ў вёсках. На Дзяпропэтроўшчыне справаздачная кампанія праходзіць вельмі жвава. Прысутнасьць выбаршчыкаў на сходах дасягае ў нек-торых раёнах 75 проц. усіх сялян. Бядняцка-серадняцкія масы выказваюць вялікую актыўнасьць, спрэчкі праходзяць вельмі жвава. У некаторых месцах павялічваецца актыўнасьць кулакоў. У Новаазаскоўскім раёне, напрыклад, кулакі агітуюць за „гаспадарныя саветы". Кулакі маюць, аднак, належны адпор ад беднякоў і серадняцкоў. У некаторых мясцовасьцях Арцёмаўскае акругі кулакі спрабуюць сарваць перавыбарчую кампанію. Напрыклад, на сходзе сялян Калінаўкі, Пакарсьнянскага раёну, кулакі падгаварылі беднякоў і серадняцкоў ня пушчаць сваіх жанок на перавыбарчыя сходы. Часам кулакі ўжываюць і зброю. Так, у вёсцы Мейсай група кулакоў на чале з ранейшым жандарам учыніла замах на жыцьцё мясцовага настаўніка-грамадзянга працаўніка, які выступіў за чыны ўдзел жанчын у перавыборах. Агітацыя кулакоў, аднак, амаль-што ўсюды сустрэнае арганізаваны адпор з боку беднякоў і серадняцкоў.

Бунт азьвярэлага кулацтва.

РАСТОЎ-ДОН. У зьвязку з перавыбарамі ў Данской акрузе ізноў мелі месца замахі на жыцьцё сельскіх і валасных працаўнікоў. У сяле Пакоўскім, Мячэтынскага раёну цяжка паранен ударам жалезнага прута ўпаўнаважаны райвыбарчага камітэту Сьмірноў, які выявіў энэргію ў справе падрыхтоўкі да перавыбараў саветаў. У замаху на яго жыцьцё падазраюць кулакоў. Вядзецца сьледзтва. У гэтым-жа раёне паранен у руку старшыня Верхня-Харольскага сельсавету Карнаноў, які варочаўся з пасяджэньня сельскага выбарчага камітэту. Кулакі, якія паранілі Карнаноўа, затрыманы. Жыхарства патрабуе суровага пакараньня іх.

* * *

КРАСНАЯРСК, 12-12. У зьвязку з перавыбарамі саветаў кулакі павялічылі тэрарыстычную дзейнасьць. У двух вёсках зьбіты калектывісты. 11-га сьнежня ў вёсцы Падгорнай, Янісейскага раёну, спалена школа і зьнішчаны справы сельсавету. На месца злачынстваў выехала сьледчая ўлада.

Ліст М. Горкага адэскім хлебапёкам.

АДЭСА, 11-XII. Рабочыя хлебнага заводу ЦРК са сходу, прысьвечанага 11-м угодкам Кастрычніковае рэвалюцыі, паслалі М. Горкаму ў Сарэнта тэлеграму, у якой прасілі даць згоду на прысваеньне іх заводу яго імя. Ад Горкага ў адказ прыслана такая тэлеграма: «Шчырая падзяка таварышом за гонар. Вы вельмі парадавалі мяне сваёю ўвагаю, а яшчэ большую радасьць дае мне тое, што паступова і са ініцыятывай, якое вы самі не заўважаеце, рабочы народ становіцца сапраўдным гаспадаром свайго краю".

Чарноўскія капальні на 7-гадз. дзень.

ЧЫТА, 11-XII. Сёньня чарноўскія каменнавугольныя капальні перайшлі на 7-мігадзінны рабочы дзень. На скарочаны дзень пакуль-што перайшоў адзін рудник і частка мэханічнае майстэрні. Поўны пераход капальняў на 7-мігадзінны дзень ажыцьцёвіцца ў бліжэйшых паўгода.

Збор чыгуначнага лому на Украіне.

ХАРКАЎ, 12-XII. Кампанія збору дому на Украіне хутка скончыцца. У Кіеве на прадпрыемствах на ініцыятыве камсамольцаў сабрана 175 тон лому. У кватэрных кампэратывах сабрана 1575 тон лому. Лістападаўскі плян выканан на 120 проц. У Чаркаскай акрузе сабрана і пагружана больш 500 тон лому. У Шчарбінскай акрузе сабрана 490 тон. Усе грошы, атрыманыя арганізацыямі ад збору лому, пойдуць на дапамогу школе.

Камсамольцы Шчарбінаўскага і Жалязьнянскага раёнаў наладзілі суботнік на дапамогу школе на рудніках, здабыўшы тысячу пятнаццаць вугалю. На дапамогу школе на акрузе сабрана больш 90 тысяч рублёў.

У Польшчы.

Спроба замаху на львоўскае консульства СССР.

*ВАРШАВА, 11-12. Водлуг паведамленьняў газэт, львоўская паліцыя затрымала каля будынку савецкага консульства ў Львове двох западозраных невядомых асоб. Затрыманыя прызналіся, што яны былі наняты нейкім Чулоўскім, які быў у польскім сакрэтнім брылі. Чулоўскі

Пленум Менакругкому КПБ(б).

ПЛЕНУМ МЕНСКАГА АКРУГОВАГА КАМІТЭТУ КП(б)Б СКЛІКАЕЦЦА 18-ГА СЬНЕЖНЯ А 10 ГАДЗІНЕ РАНІЦЫ Ў МАЛОЙ ЗАЛІ КЛЮБУ ІМЯ КАРЛА МАРКСА.

МЕНАКРУГКОМ КПБ.

Рашучы адпор праваму ўхілу і прымірэнцтву

Рэзалюцыя

партактыву Мазырскай гарадзкой арганізацыі КП(б)Б. Прынята аднагалосна 8-XII-1928 г.

Заслухаўшы і абгаварыўшы даклад т. Гантмана аб выніках работы пленумаў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, мазырскі партактыў палком далучаецца да пастаноў пленуму ЦК і лічыць іх адзіна правільнымі, выцякаючымі з рашэньняў XV з'езду партыі, накіраванымі на хутчэйшае ажыцьцяўленьне задач сацыялістычнага будаўніцтва, на падставе неаслабнага тэмпу індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскае гаспадаркі.

Партактыў адзначае, што прынятыя пленумам ЦК УсеКП(б) кантрольныя лічбы разьвіцьця народнае гаспадаркі палком адпавядаюць сучасным задачам сацыялістычнага будаўніцтва. Кантрольныя лічбы поўнасьцю адбіваюць генэральную лінію партыі на індустрыялізацыю краіны. Партактыў канстатуе, што пленумы ЦК зусім правільна намецілі задачы падняцьця сельскае гаспадаркі, якая зьяўляецца сырэвай і спажывецкай базай для індустрыялізацыі, і тэмп разьвіцьця якой адстае ад тэмпу індустрыялізацыі. Акруговаму камітэту і ўсёй партыйнай арганізацыі неабходна яшчэ больш удзяліць увагі справе калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, падняцьцю ўраджайнасьці і інтэнсіфікацыі. Адначасова неабходна ўсямерна пасіляць гаспадарчыя стымулы індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, садзейнічаць разьвіцьцю іх вытворчых сіл, паступова ўвядгаючы іх праз каапераваньне і калектывізацыю ў сацыялістычны сэктар гаспадаркі.

Партактыў лічыць зусім правільнымі рашэньні пленумаў ЦК аб барацьбе з правым ухілам у нашай партыі і прымірэнчасьлі адносінамі да яго, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай для партыі на сучасным этапе сацыялістычнага будаўніцтва. Таксама зусім правільны адпор з боку пленумаў ЦК «леваму» ўхілу аб'ектам трацкісцкай авантуры. Партактыў адзначае, што ў часы перавыбарчых кампаній бюро ячэек і РК выявіліся некаторыя факты, якія сьведчаць аб наяўнасьці правых настроў і прымірэнчасьніх адносін да яго з боку асобных камуністаў, як напрыклад: «Патрэбна раней стварыць настрой у вёсцы, а пасьля ўжо будаваць буйныя фабрыкі і заводы,» альбо „Няма чаго займацца правым ухілам, трэба працаваць. Правага ўхілу ў партыі няма" і г. д.

Акруговаму Камітэту БП(б)Б неабходна прыняць усе меры па выяўленьню правых настроў і прымірэнчаства ў партарганізацыі, у корані перасякаючы іх разьвіцьцё і зьнішчаючы выяўленыя факты шляхам паглыбленьня ўнутрай ідэалёгічнай барацьбы і выхаваўчай работы ў партарганізацыі.

Партактыў заваграе ўвагу ўсёй партыйнай арганізацыі на прадстаячую перавыбарчую кампанію саветаў. Гэтая кампанія ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, пры ўмовах увартага супраціўленьня наступаючаму сацыялізму з боку кулацкіх і нэпманскіх элемэнтаў, патрабуе накіраваньня ўсёй энэргіі партарганізацыі на арганізацыю батрацтва і беднаты, на яшчэ большае замацаваньне бядняцка-серадняцкага блёку і на рашучы адпор кулацка-нэпманскім элемэнтам.

Разгортваючаяся клясавая барацьба на фронце культурнае рэвалюцыі патрабуе ад кожнага камуніста напружанай камуністычнай увагі, бо барацьба на гэтым фронце зьяўляецца найбольш цяжкай замаскіраванай, дзе клясавы вораг у апошнія часы стаў больш актыўным. Апошнія вылазкі клясавага ворага па распальваньню анты-семітызму («Кастрычнік» Бабруйшчына, Калінкавічы—сяміхгодка), работа па распальваньню нацыянальнай розьні, па ўздыму нацыял-шовінізму—ёсьць контррэвалюцыйныя справы, накіраваныя супроць палітыкі партыі і пралетарыяту, якім партарганізацыя павінна даваць самы рашучы адпор, праводзячы чоткую клясавую лінію ва ўсёй культрабоце, правільна і энэргічна ажыцьцяўляючы задачы нацыянальнай палітыкі партыі.

Партактыў прызнае зусім правільнымі і своечасовымі рашэньні пленумаў ЦК аб вярбоўцы ў партыю рабочых, батракоў і аб чыстцы партыі ад сацыяльна-варожых элемэнтаў. АК і ўсёй партыйнай арганізацыі неабходна зараз-жа разгарнуць шырокую сыстэматычную работу па ўцягненьню ў партыю рабочых, батракоў, с.-г. рабочых і вясковай беднаты, у першую чаргу з калгасаў, праводзячы сыстэматычную работу па ачыстцы партарганізацыі ад разлажыўшыхся і сацыяльна-чуждых элемэнтаў.

Антыў заклікае ўсю партарганізацыю яшчэ шчыльней згуртавацца вакол ЦК і АК КПБ. На падставе шырокага далейшага разгортваньня самакрытыкі і ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, па-бальшавіцкі ўзмацняць шэраг партарганізацыі, ускрываючы і зьнішчаючы ўсе недахопы ў справе сацыялістычнага будаўніцтва, рашуча выганяя з партыі і апарату разлажыўшыхся, адарваўшыхся ад рабочае класы элементы.

Партактыў даручае АК забяспечыць глыбокую прапрацоўку рашэньняў пленумаў ЦК сярод партарганізацыі, палажыўшы іх у аснову сваёй далейшай работы.

На сходзе беларускага зямляцтва ў Маскве.

(Ад нашага кар-та).

У нядзелю, 9 сьнежня г. г., адбыўся агульны сход беларускага студэнцкага зямляцтва г. Масквы (у памяшканні Камуністычнага Унівэрсытэту Захаду імя Мархлеўскага).

На гэтым сходзе былі разгледжаны два пытаньні: справаздача Цэнтральнага Праўленьня зямляцтва і выбары новага зямляцтва і рэвкамісіі.

Сход з вялікай увагай заслухаў даклад аб працы праўленьня зямляцтва.

— Мы зараз,—гаворыць дакладчык,—зьвярнулі асаблівую ўвагу на якасны і колькасны вучот усёй працы. Так, напрыклад, у гэтым годзе заведзены членскія білеты, і зараз на вучоце лічыцца каля 700 студэнтаў (а ўсяго ў Маскве навучаецца беларускіх студэнтаў каля 3000 чал.). Як відаць, зямляцтву трэба зьвярчуць асаблівую ўвагу на ахоп працай усіх студэнтаў - беларусаў.

Пры зямляцтве працавалі сталыя камісіі і сэкцыі, у якіх прымала ўдзел шмат студэнтаў.

Сувязь зямляцтва з Менскам была больш-менш здавальняючая: у працягу году былі (на агульных сходах) заслуханы даклады: т. т. Васілевіча, Баліцкага, Ігнатоўскага і Галадзеда—аб гаспадарчым і культурным будаўніцтве БССР.

Пасьля дакладу разгарнуліся жывыя спрэчкі—пачалі «крыць» ва ўсю.

Першым выступіў студэнт Ціміразеўскай Акадэмі, які адзначыў, што праўленьне зямляцтва зусім мала кіравала іх працай і не давала належнага напрамку.

Іншыя выступаўшыя асабліва адзначалі тое, што **слаба відаецца праца са студэнтамі, якія канчаюць ВНУ ў Маскве, і павінны паехаць працаваць у БССР.**

Урэшце, на сходзе была прынята рэзалюцыя, накіраваная да ажыцьцяўленьня ўсіх галін працы сярод землякоў.

З прычыны сьвяткаваньня 10-ці годзьдзя існаваньня БССР, сход пастанавіў паслаць прывітальную тэлеграму ЦВК БССР і ЦК КП(б)Б.

Л. З.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Беднота і сераднякі калектыўна здаюць хлеб каапэрацыі.

(Случчына).

Партыйныя ячэйкі і бядняцкія групы пачалі вясьці растлумачэньне на вёсцы сярод беднаты і серадняку, за наступленьне на кулака, шляхам здачы ў каапэрацыю хлеба.

Атрыманы ў Слуцку весткі, што яшчэ шэраг вёсак рыхтуюць здачу, у прыватнасьці Бранчыцы, Цараўцы, Працавічы і інш.

Таксама ўнесена прапанова правесьці пераклічку сярод бядняцка-серадняцкіх мас сялянства розных вёсак за калектыўную здачу хлеба.

Сяляне вёскі Заўшыцы (Случчына) калектыўна здаюць хлеб у каапэрацыю.

Сяляне вёскі Замошье і Заўшыцы першыя здалі хлеб у Слуцкае аддзяленьне каапэрацыі. На здымку з чырвоным сьцягам селянін Саханчук-бядняк, які арганізаваў калектыўную здачу. Прывезена 200 пудоў.

Трэба ўсёй грамадзкасьці, рабселькорам, беднаце, прыняць актыўны ўдзел у справе хлебазагатовак.

Дашко.

Клясавы вораг у працоўнай школе

(Ліст з Мазыру).

Калінкавічы—гэта месца, дзе асабліва востра выяўляюцца клясавыя супярэчнасьці, дзе асабліва моцная барацьба паміж новым і старым. З аднаго боку—вузлавая станцыя з значным лікам чыгуначных рабочых, з другога—вялікае мястэчка з яго гандлёва-патрыархальным укладам. Для выяўленьня клясавых супярэчнасьцей сярод сялянства досыць назначыць, што іменна ў Калінкавіцкім раёне ў 1913-14 г. г. праводзілася вялікая праца па выкананьню сталыпінскай рэформы, і ў працягу некалькіх год вырас значны лік хутароў. Усіх гэтых аналічнасьцяў ня ўзялі пад увагу кіраўнікі калінкавіцкай школы.

Укамплектаваньне школы праводзілася без улічэньня клясавага пахаджэньня. У выніку гэтага ў школу з 213 вучняў было толькі 17 дзяцей беднякоў, вызваленых ад сельска-гаспадарчага падатку, дзяцей кулакоў мелася 16. Дзяцей рабочых мелася 15, служачых 30, саматужнікаў 44, гандляроў 5, іншых 8 і г. д.

У школе шырока разгарнуўся антысэмітызм і яўрэйскі шавінізм. Нацыянальная розьнь дасягнула незвычайных разьмераў, даходзячы да таго, што за ўсіх клясах яўрэі і беларусы сядзяць асобна, —на адзін бок яўрэі, на другі—беларусы. Дзеці—яўрэі і беларусы па-за школай не сустракаюцца адзін з другім. Апроч „кыд" «мужык»,—іншых выразаў нельга пачуць у школе. Вучні беларусы сабралі подпісы проці члена школьнага камітэту—яўрэя, каб даць адвод яму ад складу камітэту.

Рэпліні „рэзаў вас Балаховіч, але не дакананў. Ня бойцеся, ён яшчэ вернецца", «бі жыдоў, ратуй Расею»,—ня рэдкасьць у калінкавіцкай школе.

У камсамольскай ячэйцы школы—два лягеры—яўрэі і беларусы. На сходзе, дзе разглядалася пытаньне аб барацьбе з антысэмітызмам — камсамольцы - беларусы ўстрымліваліся ад галасаваньня.

Настаўнікам яўрэям пагражалі кулакамі і нават... нажамі.

Як адказ на антысэміцкія выхадкі, а таксама, як вынік упливу рэшткаў сіёнісцкага і мяшчанска-нэпманскага асяродку—мелі месца і выяўленьні яўрэйскага шавінізму.

Настаўніцтва школы своечасова не рэагавала на гэтыя хваравітыя зьявішчы, яно прамаргала іх. Зусім не зварочвалася ўвагі на інтэрнацыянальнае выхаваньне вучняў; у праграмах грамадазнаўства нават не закраналіся пытаньні нацыянальнае палітыкі. Цікавы штрых, заслухаўшы абежнік акруговага інспэктарыяту нар. асьветы аб узмацненьні працы па інтэрнацыянальнаму выхаваньню ў школе, школьны савет ухваліе наступную пастанову: „Узмацніць НАЦЫЯНАЛЬНАЕ выхаваньне ў школе".

Як жа ў выніку рэагавала настаўніцтва школы на ўсе спамянёныя зьявішчы.

Быў наладжан палітсуд над вучнем Ганчаронка па абвінавачваньні яго ў антысэмітызьме. У прысудзе палітсуду гаворыцца: „у мэтах узьмяцьця дысцыпліны і канчатковага зьнішчэньня антысэмітызму вучня VI групы Ганчаронка Лёвы выключыць з складу вучняў школы".

Наіўныя людзі, выключэньнем аднаго, праўда вельмі заўзятага антысэміта, яны думалі адначэць становішча... Водгук пастановы акруговага інспэктарыяту Нарасьветы ясьлівей з працы загадчык школы т. Ліньневіч за недазвальняючае кіраўніцтва жыцьцём школы і няправільнае ее ўкамплектаваньне.

Адначасова інспэктарыят нарасьветы лічыць неабходным перавод некаторых вучняў на здольнейшых вострых адмежавацца ад выяўленьня антысэмітызму і яўрэйскага шавінізму. Усяму школьнаму савету отавіцца на від. Будзе праведзена таксама чыстка школы па сацыяльнай адзнацы, з мэтаю магчыма большага ўцягненьня ў школу дзяцей рабочых. Узмацняецца сапраўднае інтэрнацыянальнае выхаваньне вучняў.

М. ГОХФЭЛЬД.

КАЛЕКТЫЎ ДАПАМОГ.

(Баеўскі сельсавет, Ляднянскі раён).

У в. Лапіроўшчына ў гэтым годзе ўтварыўся калектыў. Калектыў купіў малатарню, пры якой ёсьць загадчык, які працуе з гэтай малатарняй, езьдзіць па вёсках і там малоціць. За адзін дзень бярэ 5 р.

За дзень малатарняй можна абмалаціць усю ярыну, ды к таму пры малацьбе машынай бывае куды больш насеньня, чым пры малацьбе ручным спосабам. Падругое, сялянам па трэба клапаціцца аб дровах, бо пры малацьбе машынай ня трэба сушыць, а можна малаціць сырамалотам, пасьля малацьбы сушыць можна і ў хаце на печы. Гэткая малацьба скарацілa шмат часу.

Калектыў аказвае вакольнаму сялянству значную дапамогу.

Л. Цяглоў.

Зразумелі карысьць пасёлкавага землякарыстаньня.

(Ляднянскі раён, Аршаншчына).

Сяляне вёскі Іскозы, Ляднянскага раёну, Аршанскай акругі, два гады таму назад гаварылі аб тым, каб перайсьці на пасёлкавае землякарыстаньне. І вось калі было землеўпарадкаваньне, беднота перайшла на пасёлкі. Больш заможныя сяляне сьміяліся над беднякамі і казалі:—хай... паглядзім, як гэтыя галадранцы будуць весьці сваю гаспадарку на пасёлках, апроч склокі нічога ня будзе.

Але на справе вышла зусім іншае. Сяляне беднякі памаленьку перабраліся на пасёлкі.

Зараз на пасёлках мы можам убачыць і канюшыну, і кармавыя травы, і кораньплоды. Зьявілася думка ў пасёлкаўцаў набыць агульныя с.-г. прылады для сумеснай апрацоўкі глебы.

В. Цэлікаў.

За ашуканства і спэкуляцыю—пад суд.

Гр-н м. Расва, Расьлянскага раёну, Аршанскай акругі, Крэндзель Ёсель, трымаў прыватную крупарушку і, ня гледзячы на пастанову ўлады, браў збожжа за абгон крупы і перапрацоўваў на крупу, якую не здаваў у каапэрацыйныя установы, а прадаваў прыватным асобам па 18 кап. за фунт.

Дачка яго Хася Крэндзель выдавала завозчыкам фальшывыя квіткі і на пісала ў іх сапраўднай лічбы.

Гэтым самым Крэндзелевы ўхіляліся, як прыватнікі, ад кантролю ўлады. Нарсуд Расьлянскага раёну 2 сьнежня 1928 г. прыгаварыў Крэндзеля Ёселя да штрафу ў карысьць дзяржавы на 300 руб., а Крэндзель Хасю—да 3-х месяцаў зьняволеньня.

Н. Афанасьяў.

РЫХТУЕМСЯ ДА 10-ГОДЗЬДЗЯ БССР.

Барысаў, 12-XII. У Барысаве шырока разгарнулася падрыхтоўка да сьвяткаваньня 10-годзьдзя агалашэньня БССР. Мясцовае краязнаўчае таварыства рыхтуе да выпуску «абгляд Барысава за 10 год». Да гэтай працы прыцягваюцца студэнты тэхнікуму і вучні школ.

Да дню 10-годзьдзя гарсавет рыхтуе адчыненьне новай вялікай больніцы, новых ясель на „Чырвонай Бярэзіне" і будзе праведзена закладка дому саветаў у Н. Барысаве. Пачнецца таксама работа па пераабсталяваньню заводу імя Леніна ў макаронную фабрыку.

НОВЫЯ ДЗІЦЯЧЫЯ КАНСУЛЬТАЦЫІ І ЯСЬЛІ.

Гомель, 12-XII. Для адзначэньня 10-цігодзьдзя існаваньня жанаддзелаў, Гомельскі акрвыканком адпусьціў 2500 руб.

Гэтыя сродкі пойдуць на адчыненьне дзіцячай кансультацыі ў Камарынскім раёне.

На запалкавай фабрыцы «Везувий» намячаецца сёлета арганізаваць вячарнюю вымену ў ясьлях для дзяцей работніц.

КРЭДЫТАВАНЬНЕ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ.

Магілеў, 12-XII. Гэтымі днямі з Менску атрыманы сродкі на крэдытаваньне сельскай гаспадаркі. Паміж іншым атрымана 20.000 руб. на крэдытаваньне перасяленьня ў час землеўпарадкаваньня, 32.000 руб. на канцэнтраваныя кармы, якія будуць адпускацца сялянам праз малочныя таварыствы.

Апрача таго адпушчана 2500 руб. на загатоўку палепшанага насеньня да пасеўнай кампаніі.

Да ведама дапісчыкаў газэты „Савецкая Беларусь".

УСЕ МАТАР'ЯЛЫ, ПРЫСЬВЕЧАНЫЯ СЬВЯТКАВАНЬНЮ 10-ГОДЗЬДЗЯ АГАЛАШЭНЬНЯ БССР, ПАВІННЫ БЫЦЬ ДАСЛАНЫ У РЭДАКЦЫЮ НЕ ПАЗЬНЕЙ 24 ГЭТАГА СЬНЕЖНЯ.

Становішча землеўпарадкаваньня ў Беларусі

Плян заданьня па землеўпарадкаваньню за 1927-28 г. выканан на 90 проц. На наступны год мяркуецца землеўпарадкаваць 712 тысяч гэкт.—На ўсе мерапрыёмствы па землеўпарадкаваньню мае быць затрачана 1.600.000 руб.

Водлуг плянаў акруговых зямельных аддзелаў, на 1927-28 г. было вызначана землеўпарадкаваць 526 тысяч гэкт. Па папярэдніх весткаx і па няпоўнасьцю яшчэ апрацаваных матар'ялах, у мінулы сэзон землеўпарадкавана 488 тысяч гэкт. ці 90 проц. заданьня. Гэтыя 488 тысяч гэкт. падзяляюцца на наступныя віды работ: 363 тысячы гэкт. па сялянскаму землеўпарадкаваньню, 23 тысячы гэкт. па ўпарадкаваньню дзяржаўнай зямельнай маемасьці, 22 тысячы гэкт. па адмежаваньні зямель гарадоў і зямель спэцыяльнага прызначэньня і 80 тысяч гэкт. па надзяленьню бязямельных і малазямельных.

Пераважнай формай землеўпарадкаваньня ў праведзенай працы зьяўляюцца калектыўныя формы, як калгасы і пасёлкі, якія займаюць 80-85 проц. ва ўсім маштабе работ, што сьведчыць аб напраму ў бок пашырэньня калектыўных формаў землякарыстаньня.

Колі-ж параўнаць якасьць работ з работай па землеўпарадкаваньню за мінулы год, то тут можна ўбачыць значныя дасягненьні.

У параўнаньні з 1926-27 г., у апошнім сэзоне мерапрыёмства па землеўпарадкаваўчаму пляну даюць рост на 27 проц., у той час, калі тэхнічны склад павялічыўся ўсяго на 10 проц. Апошнія лічбы сьведчаць аб тым, што прадукцыйнасьць каморніцкіх работ значна п авысілася.

Значная работа была праведзена па землеўпарадкаваньню працоўных яўрэяў і адшуканьні калёнізацыйных фондаў. Па ўпарадкаваньню яўрэйскага насельніцтва было адведзена 5800 гэкт. лядных зямель, адмежавана 17 тыс. гэкт. забалочаных зямель і ня поўнасьцю закончана праца па землеўпарадкаваньню 9-ці мястэчак. Дзеля выяўленьня калёнізацыйных фондаў дасьледаваны 640 тыс. гэкт. балот.

Трэба спыніцца на тых перашкодах, якія не далі магчымасьці поўнасьцю выканаць заданьне. Сюды адносіцца недакамплектаваньне тэхнічнага пэрсаналу частковае тармажэньне работ у паўночных акругах; з прычыны непры звычаенасьці несельніцтва да пасёлкавай формы землякарыстаньня і, урэшце, наспрыяючыя мэтэорологічныя ўмовы.

Пры правядзеньні землеўпарадкаваньня мінулага году зварачвалася ўвага на фасіраваньне землеўпарадкаваньня ў прамысловых і прыгранічных раёнах і правядзеньне землеўпарадкаваньня гнёздавым мэтадам, галоўным чынам, вакол савгасаў і калгасаў Усяго да гэтага часу ў БССР землеўпарадкавана 44,2 проц. тэрыторыі с-г значэньня, а асноўнае землеўпарадкаваньне ўсяе тэрыторыі мяркуюць закончыць у бліжэйшае 5-годзьдзе.

На 1928-29 г. вызначана землеўпарадкаваць 712 тысяч гэкт.: 496.000 гэкт. сялянскага землякарыстаньня, 89 тыс. гэкт. па надзяленьню бязямельных і малазямельных, 15000 гэкт. калёнізацыйнага фонду і інш.

Усяго на каморніцкія работы на наступны год па пляну вызначана 1600.000.

Мерапрыёмствы да разьвіцьця ільнаводзтва.

Наркамзем ужывае цэлы шэраг мерапрыёмстваў па пашырэньню і разьвіцьцю ільнаводзтва і канопляводзтва. Разгортваецца больш стала навукова-дасьледчая справа па ільнаводзтву. Віцебскай вопытнай с.-г. станцыі надаецца ільнаводны ўхіл. Пры станцыі арганізуюцца 2 аддзяленьні: па культуры і апрацоўцы лёну і канаплі. На арганізацыю апошняга аддзяленьня нядаўна асыгнавана звыш 75 тысяч руб. з спэцыяльных сродкаў прамысловасьці.

Адначасна з гэтым распачата падрыхтоўка спэцыяльных аграномаў па ільнаводзтву. 15-га сьнежня накіроўваецца на 2-хмесячныя курсы перакваліфікацыі ў Дзіцячае Сяло 8 аграномаў.

У сёлетнім годзе будзе шырока разгорнута будаўніцтва дробных прадпрыёмстваў для апрацоўкі ільна-валакна, сушылак, мялак і інш. Гэтыя прадпрыёмствы будуць арганізоўвацца па лініі с.-г. каапэрацыі і савгасаў.

Да буйных прадпрыёмстваў па апрацоўцы валакна трэба аднесьці пабудову Лёзьненскага ільна-апрацоўчага камбінату, які будзе перапрацоўваць у год звыш 150 тысяч пуд. ільнянай саломы. Закладка гэтага камбінту прыстасавана да сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя БССР.

Зьвернута належная ўвага на пашырэньне ільнаводзтва ў савгасах. У 1928-29 г. у савгасах Белсельтрэсту мяркуецца заняць пад культуры ільну звыш 220 гэкт. супроць 24 гэкт. у 1927-28 г.

Дзеля таго, каб спыніць распаўсюджваньне асобнае хваробы лёну, ад якой расьліна засыхае, будзе прыступлена да кантролю насеннага матар'ялу і да абязшкоджваньня яго.

У 1929 г. мяркуецца ўжываць мінэральнае ўгнаеньне, як абавязковае пры кантрактацыі лёну. Кантрактацыя мае быць праведзена на 30.000 гэкт. лёну і 3000 гэкт. канаплі. У наступную вясну мяркуецца ачысьціць на трыерах і ільнатрашчотках 91000 цэнтн. насеньня, што складае 65 проц. усяго пасяўнога матар'ялу.

Належная ўвага зварачаецца на забесьпячэньне ільнаводных райёнаў танным хлебам і прамтаварамі.

Цэны на ільна-валакно на 1928-29 г. павышаны для БССР на 28 проц. супроць цэн мінулага году.

Стымуляваньне прамысловага ільнаводзтва мяркуецца праводзіць шляхам палёгак на падатку. НКЗ мяркуе ўвайсьці ў СНК БССР з хадайнічаньнем аб прадастаўленьні скідак па с.-г. падатку для прамысловых і паўпрамысловых ільнаводных і канаплянаводных райёнаў.

НКЗ зварачвае належную ўвагу на прапаганду ільна-разьвядзеньня і ільна-апрацоўкі. У цэлым шэрагу райёнаў будуць арганізоўвацца курсы, лекцыі, гутаркі, паказальныя вучасткі.

Да грунтоўных мерапрыёмстваў у галіне лепшае пастаноўкі ільнаводзтва трэба аднесьці рашэньне НКЗ закончыць землеўпарадкаваньне 17-ці ільназодных райёнаў БССР у працягу бліжэйшых 2-х год.

НА ПАЛІТЫЧНЫМ КРУГАВІДЗЕ.

Пытаньне аб эвакуацыі Надрэніі.

Яшчэ на летняй сэсіі рады Лігі Нацый нямецкая дэлегацыя запрапанавала разглядзець пытаньне аб эвакуацыі саюзнымі войскамі акупаванай імі Надрэніі. У адказ на гэта міністр замежных спраў Францыі Брыян сказаў такую дзёрзкую ў адносінах да Нямеччыны прамову, што спадзявацца на пажаданае для апошняй вырашэньне справы ня прыходзілася.

Перагаворы, якія, аднак, усё-ж пачаліся ў Жэневе ў адсутнасьці Чэмбэрлена і Штрэзэмана, закончыліся апублікаваньнем пастановы, якую кожны контрагэнт мог разумець, як хацеў. Лёрд Кашэндэн ня быў, відаць, закліканы адыграць рашучую ролю ў вялікай францускa-нямецкай спрэчцы. Англія хацела быць арбітрам між Парыжам і Бэрлінам. Таму ў Жэневе Англія і трымалася палітыкі адняжак, каб вычакаць рэзультатаў прэзыдэнцкіх выбараў у ПАЗ Штатах. Калі перамога Гувэра выявіла з дастаткова выразнасьцю антыангельскі напрамак палітыкі ПАЗ Штатаў, у Лёндане сталі сур'ёзна думаць аб англа-францускім паразуменьні. Чэмбэрлен паведаміў у ангельскім парляманце, што справа перадтэрміновай эвакуацыі Надрэніі павінна быць разгледжана як з пункту погляду **праўнага, так і з пункту погляду палітычнага.**

Падыходзячы да справы фармальна, трэба зьвярнуць увагу на 431 арт. Вэрсальскага трактату, у якім сказана, што «акупацыйныя войскі будуць вараз-жа адкліканы, калі да сканчэньня 15-гадовага тэрміну (гэта значыць у 1935 годзе) немцы выканаюць усе абавязкі, якія вынікаюць для іх з памянёнага трактату». Ангельскія экспэрты знайшлі, што Нямеччына ня можа домагацца перадтэрміновай эвакуацыі нават у тым выпадку, калі будуць рэгулярна выплачваць рэпарацыйныя ўносы, устаноўленыя плянам Дауэса. І гэта таму, што ў 429 арт. трактату, які гаворыць аб паступовай эвакуацыі трох райёнаў, сказана, што Нямеччына павінна даць гарантыі, што па зьліквідаваньні акупацыі яна ў далейшым будзе рэгулярна сплачваць даўгі.

Чэмбэрлен, аднак, ня ўспомніў, што ў канцы 429 арт. гаворыцца аб магчымасьці прадаўжэньня тэрміну акупацыі, калі саюзныя дзяржавы палічаць гарантыі, якія дала Нямеччына аб нападзе на яе, невыстарчальнымі.

Што-ж датычыцца палітычнага пункту гледжаньня, дык Чэмбэрлен плятавічна сьцьвердзіў, што «ангельскі ўрад будзе вітаць перадтэрміновую эвакуацыю Надрэніі збройнымі сіламі Францыі, Англіі і Бэльгіі, незалежна ад легальнага права былых саюзнікаў працягваць акупацыю да тэрміну, устаноўленага ў трактаце».

Асьвядчэньне Чэмбэрлена выклікала зусім зразумелае зьдзіўленьне і незадаволеньне ў Бэрліне.

Пасьля першай сваёй дэклярацыі Чэмбэрлен праз якіх-небудзь два дні адказваў у парляманце на запытаньні лявіцы, якая хацела прыціснуць яго да сьцяны і вырваць у яго прызнаньне, што ангельскі ўрад забавязаўся падтрымаць становішча Францыі ў справе Надрэніі. Апазіцыя спасылалася на пратакол, падпісаны ў 1919 годзе Лёйд-Джорджам, Вільсонам і Клемансо, які (пратакол) выразна прадбачыў перадтэрміновую эвакуацыю ў выніку паразуменьня між Англіяй, Францыяй і Злучанымі Штатамі.

Як відома, аднак, Злучаныя Штаты не ратыфікавалі Вэрсальскага трактату і не прынялі ўдзелу ў акупацыі Надрэніі. Англія і Францыя запрасілі пяпер да сваёй кампаніі Італію, Бэльгію і Японію.

Польшча таксама стала дамагацца голасу па пытаньні аб эвакуацыі Надрэніі, увяжваючы гэта пытаньне з гарантыяй сваіх заходніх граніц з Нямеччынай.

Чэмбэрлен з фармальнага боку вышаў сухім з парляманцкай дыскусіі, апіраючыся на згоду Нямеччыны разглядаць пытаньне аб эвакуацыі Надрэніі ў новым складзе дзяржаў.

Такое становішча Англіі па пытаньні аб эвакуацыі Надрэніі зьявілася на вельмі вясёлым пралогам да канфэрэнцыі ў Лугано. Нямеччына, дзякуючы пазіцыі Англіі, апынецца на гэтай канфэрэнцыі тварам да твару з рашучым адпорам заключыўшых згоду Англіі і Францыі, якія будуць вымагаць гарантыі, г. ё. кампэнсацыі грашовага характару ад прыдушанай Нямеччыны. І Нямеччыне, відаць, нічога іншага не застаецца, як, пэтаргаваўшыся, згадзіцца на вымаганьні Францыі і Англіі, ці—ў праціўным выпадку—адмовіцца ад вырашэньня справы аб датэрміновай эвакуацыі Надрэніі. Бліжэйшыя дні пакажуць, якія вынікі прынясуць перагаворы ў Лугано.

Польска-нямецкія гандлёвыя справы.

Між Польшчай і Нямеччынай няма сталага гандлёвага трактату, які рэгуляваў-бы нармальны стан іх гандлёвых узаемаадносін. Ужо некалькі гадоў існуе польска-нямецкая камісія, якая то зьбярэцца, то зноў разыйдзецца, ні да чаго не дагаварыўшыся. Калі шукаць прычын, якія перашкаджаюць абедзьвюм зацікаўленым дзяржавам дайсьці да паразуменьня, дык трэба прызнаць, што, апрача зусім зразумелага жаданьня кожнай з іх дабіцца для сябе як мага выгаднейшых умоў, ёсьць адна прычына, якая найбольш перашкаджае справе,—прычына чыста палітычная. Кіруючыя палітычныя сферы Польшчы, а за імі і значная частка польскай прэсы праз увесь час вядуць узмоцненую кампанію проці нямецкіх гандлёвых пастулятаў, думаючы сваёю ўпартасьцю зламаць нямецкую ўпартасьць. Наўрад ці можа эканамічна слабейшая Польшча разьлічаць на перамогу над куды мацнейшай, хоць і значна аслабленай усялякімі рэпарацыйнымі кантрыбуцыямі, Нямеччынай.

Польшча проста зачыняе вочы на тое, што, дзякуючы адсутнасьці ў яе сталых гандлёвых умоў з сваімі суседзямі—СССР і Нямеччынай,—яе гандлёвы баланс рэгулярна дае вельмі значныя дэфіцыты. Гандаль Польшчы з іншымі яе суседзямі не дае ёй прыбыткаў і ніколі ня здолее зрабіць гандлёвы баланс Польшчы бездэфіцытным.

З прычыны адсутнасьці сталай гандлёвай умовы з Нямеччынай, гэтымі днямі сцьвіўся экспарт з Польшчы дрэва ў Нямеччыну, які складаў да апошняй пары адну чацьвертую частку агульнага польскага вывазу. Цяпер толькі неапрацаванае дрэва можа знайсьці сабе шлях у Нямеччыну, і то толькі праз Чэхаславакію.

Зразумела, што ад гэтага польскі гандлёвы баланс яшчэ пагоршыцца, а гэта адаб'ецца як на платаздольнасьці польскага гандлю, так і на давер'і сусьветных фінансавых сфэр да польскай дзяржаўнай гаспадаркі.

Пакт Келёга і разброеньне.

«Амэрыка не зьяўляецца ні мілітарыстычнай, ні імпэрыялістычнай»—каза прэзыдэнт Кулідж у сваім апошнім «пасланьні» да кангрэсу, разважаючы аб мірнай роўнавазе, якую дае сьвету пакт Келёга. Адначасова, аднак, ён засьцярогся, што пакт, які зьяўляецца ўрачыстым проціваенным асьвядчэньнем і які заключае ў сабе забавязаньне сувэрэнных народаў утрымліваць супакой, не зьмяншае быццам права і абавязку кожнага краю абараняць свае граніцы.

Гэтыя вельмі арыгінальныя вывады Куліджа маюць быць як-бы «лёгічным» мастом між такімі супярэчнымі пачынаньнямі, як пакт Келёга, які нібы-та раз назаўсёды забараняе збройныя вырашэньні справы, як спосаб ліквідаваньня міжнародных канфліктаў, і з другога боку—узмацненьне марскіх узброеньняў ПАЗ Штатаў, на якія бюджэт Штатаў прызначае аж паўміліярда даляраў. Калі такім чынам самі тварцы і аўтары пакту Келёга ня вераць у яго жыцьцёвасьць і карысьнасьць, калі яны ўзбройваюцца ня гледзячы на тое, што іх бацькаўшчына зьяўляецца адной з магутнейшых дзяржаў, якой найменш прыходзіцца баяцца атакі якой-небудзь дзяржавы, ці-ж можна пасьля гэтага паверыць у якое-небудзь фактычнае значэньне пакту Келёга. Мала засталося ўжо людзей, нават сярод буржуазных палітыкаў, якія вераць яшчэ ў розныя пакты Келёга. Усім цяпер ясна, што, ня гледзячы на заключэньне пакту амаль ня ўсімі дзяржавамі сьвету, у міжнароднай палітыцы нічога не зьмянілася. Усе гэтыя мілыя гутаркі аб разброеньні, аб вырашэньні розных канфліктаў толькі мірнымі спосабамі—адна мана.

Большага палітычнага цынізму, як адначасовае высоўваньне перад усім сьветам мірных прапазіцый і калёсальнае павялічэньне ўзброеньняў, у гісторыі капіталізму і імпэрызму яшчэ ня было. Капіталістычны сьвет даходзіць да свайго лёгічнага канца—да калёсальных узброеньняў, патрэбных чыну для змаганьня з іншымі капіталістычнымі канкурэнтамі, і да калёсальнай маны і фальшы, якімі ён хоча прыкрыць праўдзівую сваю сутнасьць.

А што ў Эўропе?

Пад акампанімэнт такіх-жа фальшывых гутарак аб мірных заданьнях палітыкі кожнай з імпэрыялістычных эўрапейскіх дзяржаў ідзе далейшае павялічэньне ўзброеньняў гэтых дзяржаў. Англа-французкая ваенна - марская згода паставіла гэтыя дзьве дзяржавы па-за ўсякай магчымай канкурэнцыяй з боку іншых эўрапейскіх дзяржаў. Італія, Гішпанія, Грэцыя, Нямеччына і некаторыя іншыя эўрапейскія дзяржавы, нават калі-б яны сабралі ўсе свае марскія сілы разам, ня могуць і думаць аб канкурэнцыі з Англіяй і Францыяй. Ваенна-марская гегемонія Англіі і Францыі над Эўропай а ў некаторай ступені і над усім саветам—факт, ц

Жыцьцё і праца асьветніка

Таварышы асьветнікі!

Да 10-й гадавіны існаваньня БССР выйдзе спэцыяльны нумар „Савецкай Беларусі", які побач з агульнымі дасягненьнямі нашай краіны павінен будзе адбіць і наш рост у культурна-асьветнай галіне за дзесяць гадоў. Дасылаючы спэцыяльны матар'ял да юбілейнага нумару газэты, просьба паклапаціцца, дзе магчыма, і аб фатаграфіях, якія навочна пачаказалі-б нашы заваёвы на культурна-асьветным фронце. У прыватнасьці, важна было-б мець фатаграфіі новых школьных будынкаў, школ у былых панскіх маёнтках і г. д. Скарыстаныя ў газэце фатаграфіі будуць аплочаны.

РЭДАКЦЫЯ.

Школа не павінна займацца без зямлі*)

Школьная зямля шукае свайго гаспадара. Ці павінна гэтак быць? На мой погляд,—не павінна, ды і шукаць ёй нечага:

Калі школе адвезен школьны вучастак, дык гаспадаром на гэтым вучастку павінна быць, бязумоўна, сама школа, а не сельсавет ці РВК.

Тым больш, што вясковая школа імкнецца набыць сельска-гаспадарчы ўхіл у сваёй працы, а без зямельнага вучастку яна дасягнуць гэтага ня зможа.

Зусім іншая справа—як выкарыстоўваецца школьны вучастак.

Калі школьная зямля здаецца ў аренду звычайнаму арандатару-селяніну, які ўжывае на ёй прымітыўныя спосабы апрацоўкі зямлі з трохпалёўкай, дык такое зьявішча, вядома, хворае. З ім трэба змагацца.

Калі-ж зямельны вучастак здаецца ў аренду з тым, што на ім будзе весьціся шматпольная сыстэма, пры мазіраньні настаўніка і пад кіраўніцтвам мясцовага агранома, з правільным ладазьменам і ўжываньнем на ім ня толькі зялёнага ўгнаеньня, але і штучнага, дык з такой арэндай яшчэ сяк-так магчыма мірыцца. Такая здача ў аренду школьнага зямельнага вучастка будзе мець карысьць для мясцовага насельніцтва. Але ўсё-ж зямельны вучастак, па магчымасьці, трэба здаваць у аренду, калі яна патрэбна камітэту сялянскай узаемадапамогі, або калгасу ці арцелі, а не селяніну-суседу.

Да гэтай здачы ў аренду зямельных вучасткаў большасьць школ прымушаны тым, што школы ня маюць свайго каня, няма і патрэбнага сельска-гаспадарчага інвэнтару. Калектыўна такія школы могуць апрацаваць гарод, насеяць кораніплоды пры ўдзеле вучняў, пасадзіць сад.

Сад павінна мець кожная школа. У садзе вучні могуць заўсёды прыняць нічыры ўдзел у працы па выраду саджанцоў, навучыцца шчапіць дрэвы, рабіць правільную абрэзку дрэў, давать дрэву розную крону, перасаджваць ня толькі маладыя, але і старыя дрэвы.

Усе гэтыя практычныя веды, здабытыя працай у садзе, школьнікі перанясуць і ў сваю гаспадарку, тым больш, што па некаторых вёсках прайшло ўнутрысяленнае разьмеркаваньне зямлі, і кожны грамадзянін, пераходзячы на новую сядзібу, імкнецца каля сваёй хаты завесьці садок з пладовымі дрэвамі.

Калі такі школьны сад мае агародну, дык у ім магчыма завесьці пчалінную пасеку.

А пчалярства да гэтага часу па вёсках яшчэ вядзецца па-дзедаўску, у калодах, рэдка сустракаюцца добра пабудаваныя рамавыя вульлі; школьная пасека ў даным выпадку была-б прыкладам для пасек вясковых пчаляроў.

У школьным садзе таксама магчыма, пры ўдзеле вучняў, завесьці невялічкі парнічок, які пазнаёміць насельніцтва з тым, як ён будуецца і як карысна мець са свайго парніка расаду і раньнюю гародніну.

Калі на школьным вучастку ёсьць добрыя сельска-гаспадарчыя будынкі, дык, па магчымасьці, школа павінна завесьці птушнік з гатунковай птушкай, або трусаводзтва, атрымаўшы ў Наркамземе патрэбныя для гэтага віду гаспадаркі экземпляры.

Пры гэткай пастаноўцы справы на школьным зямельным вучаску школа мела-б свае ўласныя сродкі, набыла-б патрэбны інвэнтар і паэбавілася-б аравдатараў.

Некаторыя школы ўжо набліжаюцца да гэткага віду працы на школьным зямельным вучастку, а некаторыя ўжо і дасягнулі добрых вынікаў, што нам вядома як з друку, так і з жыцьця. Напрыклад, Галіцкая школа, Магілеўскай акругі—школьная дзялянка дала з аднаго гэктара 162 пуды збожжа, Апчацкая школа, Менскай акругі мае прыкладную пчаліную пасеку.

Два гэктары зямлі, прадугледжаныя зямельным кодэксам, павінны цалкам быць у распараджэньні школы, а не сельсавету ці райвыканкому. Вясковая школа без зямельнага вучастку заставацца не павінна.

П. Л.

*) У парадку абгаварэньня.

ШКОЛА—НЕ БАГАДЗЕЛЬНЯ.

(Калінкавіцкі р., Мазыршчына).

У пачатку гэтага навучальнага году рэйінспэктар прызначыў у Слабадзкую 7-годку выкладчыкам сьпеваў т. Ганчарыка, быўш. справавода РВК і сакратара с.-с. На скрыпцы ён грае нішто, разьбірацца і ў нотах, але кіраваць хорам яму ніколі не здаралася. Можа крыху сьпяваць ён і навучыць. Але ці аб гэтым толькі мы павінны клапаціцца?

Пачаліся скаргі вучняў на грубасьць за лаянкі адборнымі слоўцамі з боку новага настаўніка. Здаралася, што і нагладзіць каго лёгенька па галоўцы сьпічкам. Заг. школы ўмяле вучняў менш зьвяртаць увагі на гэта, бо т. Ганчарык—чалавек хворы (хварэе падучкаю, здараліся прыпадкі і ў школе). Але вось у тым-то і справа, што ён хворы, з гэтай прычыны ён і быў зьняты з працы ў РВК і ў с.-с. Дзявацца няма куды—ну, дык, значыць, настаўнікам у сямігодку.

Настаўнікаў і вучняў зьдзівіла і яшчэ адно прызначэньне. З 7-ХІ выкладчыца грамадзнаўства атрымала водпуск па цяжарнасьці.

Мясцовы заг. хаты-чытальні т. Дронік парашыў „падзарабіць"—зьездзіў у РВК і прывёз ад райінспэктара паперу, што ён прызначаецца на час водпуску т. Каваленкі выкладчыкам грамадзнаўства. Хлапец ён можа палітычна і разьвіты, але настаўнікам ніколі ня быў і ня мог быць з прычыны малапісьменнасьці. Праўда, ён не прэтэндаваў на ўсе лекцыі, а напрасіў, каб яму далі лекцыю грамадзнаўства ў V клясе, якія і атрымаў.

У V клясе з гэтага году выкладаньне пераведзена на комплексную сыстэму, і грамадзнаўства ў ёй зьяўляецца асяродкам усёй працы, а тут грамадзнаўства вылучаецца для непадрыхтаванага чалавека.

Што-ж нам дадуць нашы новыя настаўнікі, якія ў дадатак і беларускай мовы ня ведаюць? Бязумоўна, апрача шкоды не дадуць нічога.

Ці ня зробіць школа замест кроку наперад некалькі крокаў назад пры такіх абставінах? Трэба яму след зьвярнуць на гэта ўвагу і навучыць райінспэктара шанаваць нашы школы.

Дзядзька.

А вучні хварэюць...

У в. Столбцы, Халопеніцкага райбну (Меншчына) амаль што палова вёскі хварэе на вочы, а таксама і палова вучняў школы. Настаўнікі яшчэ 17 кастрычніка г. г. паслалі адносіну ў Кашчынскі с.-с., каб ён паклапаціўся аб прысылцы доктара высьветліць хваробу і папярэдзіць далейшае распаўсюджаньне яе. Прайшло 10 дзён, а вынікаў ніякіх. 27 кастрычніка в другой адносінай, ужо ў РВК, накіраваўся пяшэчкам за 15 клм. загадчык школы даведацца аб выніках і быў дужа зьдзіўлены, калі ў РВК яму адказалі, што доктар ужо быў і шмат каштавала загадчыку ўпаўніць РВК, што доктара ня было, ды яго і па гэты час няма ў сталбцоўскай школе.

Ма'быць надта нясмачна ехаць за 15 клм. у вёску да хворых медыцынскім працаўнікам халопеніцкай больніцы, але нясмачна-ж прапавать і настаўнікам з хворымі вучнямі. А тым часам і другая хвароба „кор" таксама заглянула ў школу і палажыла ў ложак каля 10 вучняў.

Вал.

Кніга—бліжэй да асьветнікаў.

(Тураўскі р., Мазыршчына).

Тураўскі раймясцком працасьветы кнігі са сваёй бібліятэкі разаслаў па райёне прафдэлегатам у выглядзе „бібліятэкі перасоўкі". Прафдэлегаты павінны распаўсюджваць кнігі сярод асьветнікаў.

Гэта надта добра, бо вясковае настаўніцтва з прычыны далёкай адлегласьці ад м. Турава не магло карыстацца сваёй бібліятэкай.

Гэты прыклад тураўскага раймяскому варта скарыстаць іншым мясцкомам. Толькі трэба аддаць больш увагі падбору кніг для асьветнікаў і наогул набыцьцю больш сталай літаратуры для асьветнікай бібліятэкі.

Асьветнік

На дапамогу школе.

(Мазыршчына).

Рабочыя фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік» зрабілі пядзельнік на карысьць школы пры фабрыцы. Увесь заработак за гэты дзень рабочыя аддалі на абарудаваньне фізычнага габінэту пры школе.

М. Г.

Шукаем свой мясцком.

І ўсё, здаецца, зрабілі асьветнікі Калінкавіцкага райёну (Мазыршчына) так, як трэба. Сабраліся перад пачаткам вучэбнага году на райённую канфэрэнцыю, абралі мясцком, даручылі яму кіраваць справай і разьехаліся на сваіх школах. Але вось ужо тры месяцы канчаецца, а мясцкому як няма. Кампанія зьмяняе кампанію, усюды бурліць жыцьцё, а наш мясцком—ані слова. У райёне шмат новых настаўнікаў, якія патрабуюць дапамогі як з боку вытворчага, так і з прафесыйнага, але мясцком нічога на робіць, а калі і робіць, дык няпляна, што не дае належнай карысьці.

Калі настаўнікі прыяжджаюць у Калінкавічы і хочуць пабачыцца з працаўнікамі мясцкому, дык і гэта не ўдаецца, бо мясцком увесь захаваўся і яго цяжка знайсьці. Таму мы і парамылі шукаць наш мяском праз „Савецкую Беларусь".

Настаўнікі.

Наша перапіска.

Д. Юдзанкову. Барозні. Вашы «Некалькі запытаньняў» пераслалі ў Магілеўскую акр. інспэктуру Нарасьветы.

Дукорскаму. Допіс «Знайшлося і месца» друкаваць ня будзем. Зьвярніцеся на гэтай справе ў сельсавет.

А. Ш-у. Выдрэя, Віцебшчына. Ваш артыкул аб насьняхованьсці бядняцкіх дзяцей нічога новага не дае. Пра Кастрычнікавае сьвята зараз друкаваць запозна. „Бяльмо на воку" будзе друкавацца.

С. Ш. Мазыршчына. У сваёй заметцы „Няма чаго дзівіцца" вы нічога канкроднага ня кажаце па справе наст. Шуляковскага, а толькі прыводзіце свае агульныя меркаваньні наконт працы і паводзінаў настаўнікаў. Друкаваць ня будзем.

№-ў. Мазыр. „Наш выклік" друкаваць ня будзем—дробязь.

І. Смыкаву. Ляды. Раім перамяніць старшыню вашай чытальні. Друкаваць няма сэнсу.

А. Станіку. Менск. Адна толькі годнасьць слухача прафшколы яшчэ не дае права на залічэньне ў прафсаюз. Заметка друкавацца ня будзе.

Прыняцелю (Замосьце), Я. Савіцкаму і Бароўчанку (Рагачэў). Пераслалі ў ЦК саюзу працасьветы.

За палепшаньне дарог, за машынізацыю транспарту!

Захаваем масты і шляхі ад разбурэньня.

Ня трэба гаварыць аб тым, што ў нас вельмі кепскія дарогі. Гэта вядома кожнаму селяніну, які адчувае на сабе ўсе цяжкасьці і страты, якія ўчыняюць насельніцтву і дзяржаве кепскія шляхі зносін.

Дзяржаўныя дарожныя органы штогод прыкладаюць усе свае сілы на тое, каб вырабіць прыгоднай для праезду хоць-бы нязначную частку дарог. Аднак, пры ўсё больш і больш узрастаючых асыгнаваньнях на палепшаньне дарог, усё-ж адными дзяржаўнымі сродкамі гэткую задачу нельга выканаць. Неабходна, каб насельніцтва было само зацікаўлена ў падтрыманьні дарог і мастоў і выказала-б сваю самадзейнасьць у галіне дарожнага будаўніцтва.

Досыць тапіцца ў гразі і лаяць калёсы!

Што-ж мы бачым на справе? Дарожныя органы пабудавалі новы мост, а на другі дзень усе гайкі і шрубы былі выцягнуты; праз некаторы час сяляніны, які там праяжджаў, для хатніх патрэб, увозіць парэнчы, а пасьля гэтага селькоры пачынаюць скардзіцца, што па месьце нельга праехаць, што ён весь у дзюрках і г. д.

Пабудавалі новую дарогу... Кожнаму вядома, што яна ў каляіну псуе дарогу, што калі адна палова дарогі вусім не закранута, другая каляінамі зруйнавана да немагчымасьці... І вось дакуючы гэтай несьвядомасьці насельніцтва, дарогі праз год зноў трэба рамантаваць.

Насельніцтва на сродкі ад самаабкладаньня брукуе вясковыя вуліцы і дарогі... Гэтую працу робяць сваімі сіламі, бяз тэхнічнага нагляду... І дарога ня толькі не палепшаецца ад такога рамонту, а робіцца яшчэ горшай, чым была раней.

Усе пададзеныя прыклады паказваюць, што ў дарожнай справе мы значна адсталі. Неабходна зьнішчыць сярод мас тыя адносіны да дарог, якія былі да гэтага часу: «калі скарбовае, дык можна рабаваць і ламаць». Ячэйкі «Аўтадору» на мясцох павінны быць грамадзкім кантролем як пры пабудове дарог дзяржаўнымі дарожнымі органамі, так і на сродкі ад самаабкладаньня; сачыць за захаваньнем дарог і дарожных будынкаў у іх райёне; наладжваць дарожныя працы праз запатрабаваньне ад акруговага адзяленьня „Аўтадору" дарожна-тэхнічных сіл і г. д.

Кожны сьвядомы селянін павінен ведаць, што барацьба з гразявай блёкадай павінна быць вельмі сур'ёзнай і чым лепш насельніцтва будзе адносіцца да дарог і мастоў, тым хутчэй мы зьнішчым гэту блёкаду.

М. Гордзін.

Шляхавае будаўніцтва ў Мазыршчыне.

Шляхавае будаўніцтва ў Мазыршчыне мае вялікае значэньне, дзякуючы геаграфічным асаблівасьцям акругі (балота), а таксама з прычыны раскіданасьці селішчаў і далёкай адлегласьці іх аднаго ад другога.

Згрунтуем вакол «Аўтадору» грамадзкасьць гораду і вёскі.

Да гэтага трэба яшчэ дадаць зруйнаваньні, учыненыя шляхаваму будаўніцтву акругі польскай акупацыяй і бандыцкімі наскокамі.

Таму асабліва яскрава кідаюцца ў вочы посьпехі, дасягнутыя ў апошнія гады ў справе шляхавага будаўніцтва ў акрузе.

Да вайны некаторыя вёскі тагочаснага Мазырскага павету месяцамі ня мелі ніякіх зносін з іншымі месцамі. Падарожжа з Мазыра ў такія пункты, як Лельчыцы, Тонеж і інш., было вельмі небясьпечна. Зараз амаль ва ўсе пункты акругі можна даехаць па аўтамабілі.

Паміж Мазыром і Калінкавічамі машляхох акруговага значэньня пабудавана шмат мастоў і грэбляў. Сёлета вялася праца па забрукаваньню пад'язных шляхоў ад г. Мазыра да ст. Мазыр, у 1929 г. работа гэта будзе скончана. Пад'язны шлях да ст. Мазыр паявіць неабходнасьці дастаўляць грузы на ст. Калінкавічы, скарачаючы ў два разы адлегласьць па дастаўцы (6 кілём. замест 12). Гэта, зразумела, дасьць немалую эканомію сродкаў.

Апроч гэтага, вялікая работа зроблена таксама на шляхох райённых і сельскіх за кошт райённых бюджэтаў і сродкаў, паступіўшых ад самаабкладаньня.

М. Гохфэльд.

КРУПСКІ КАМБІНАТ І ШЛЯХАВАЕ БУДАЎНІЦТВА.

На Аршанчыне, у Крупскім райёне ўтварыўся камбінат мясцовай прамысловасьці. У склад камбінату ўвайшлі: 2 млыны і і электрастанцыя. Меркавалася, што па тэхнічнаму стану ўвайшоўшых у склад камбінату прадпрыёмстваў, а таксама па эканамічных умовах раёну, гэты камбінат будзе мець усе падставы для сваёй прыбытковай дзейнасьці, калі на шляху яго працы ня будзе ніякіх вытворчых перашкод.

На гэтыя працы камбінат выдаў шляхаваму вучастку 5900 руб. і яшчэ маркуе выдаць 8100 руб. на гэтую-ж справу.

Такая супольнасьць у шляхавым будаўніцтве прамысловасьці і органаў шляхавай гаспадаркі зьяўляецца вельмі добрым прыкладам. Вось толькі ня добра тое, што ў даным выпадку работы пачаліся са значным спазьненьнем і што з гэтай прычыны ня гледзячы на значныя грашовыя выдаткі з боку камбінату, прамысловасьць, як гэтая, мела досыць значныя страты ў галіне сваёй вытворчасьці.



Дружнай працай праложым добрыя дарогі.

А што гэткія перашкоды могуць быць, гэта паказала практыка мінулага лета. Справа простая. Для вытворчых мэтаў прадпрыёмствам прышлося зрабіць капітальны рамонт 2-х мастоў і грэблі. Гэтая праца была перададзена шляхаваму вучастку Белгалоўшата, які працуе ў гэтым райёне. Здавалася-б, што ўсё будзе добра. Рамонтныя працы будуць скончаны своечасова, прадпрыёмствы будуць працаваць без перапынку і г. д. У сапраўднасьці трохі інакш. Па думцы Аршанскага Акрплану несваечасовы пачатак працы, па незалежных ад райвыканкому прычынах, выклікаў значныя матар'яльныя страты, у самым сэзоне ізмін не працаваў каля 2 месяцаў, а электрастанцыя каля 3-х месяцаў.

А вінаваты: стыхія, «незалежныя» абставіны, альбо людзі?

Е. Р.

Ячэйкі „Аўтадору"—пачатковая школа па вывучэньні аўтамашын

Калі праца вясковых ячэек „Аўтадору" ў бліжэйшы пэрыяд павінна быць накіравана да арганізацыі сялянскіх сіл у напрамку скарыстаньня гэткіх для прывядзеньня ў парадак дарог, дык ячэйкі «Аўтадору» ў гарадох (на прадпрыёмствах, ва ўстановах і арганізацыях) павінны зьяўляцца пачатковаю школаю, адкуль будуць папаўняцца курсы шофэраў, матарыстых, вайсковыя авіяцыйныя школы і іншыя тэхнічныя навучальныя ўстановы.

Многія з гарадзкіх ячэек «Аўтадору» маюць магчымасьць навучыць сваіх сяброў кіраванню аўтамабілем нават да набыцьця гэткага ячэйкаю. Ёсьць ячэйкі пры ўстановах, маючыя аўтамабіль і ў гэтым выпадку толькі ад бюро ячэйкі залежыць арганізаваць гурток і дагаварыцца з шофэрам, каб апошні адзін-два разы ў тыдзень праводзіў заняткі з гуртком. Гэтыя заняткі падрыхтуюць сяброў ячэйкі да больш упэўненае работы, калі ячэйкаю будзе набыта свая машына, а ў многіх ячэйках гэтыя перспэктывы маюцца.

Некаторыя з гарадзкіх ячэек нават маюць магчымасьць прыцягнуць да справы вывучэньня аўтамашын высока-кваліфікаваныя сілы—інжынэраў.

Многае ў гэтым напрамку залежыць ад ініцыятывы бюро ячэек, бо імкненьне да вывучэньня аўтамашын у членаў „Аўтадору" маецца.

Амаль кожны член «Аўтадору» ахвотна-б аддаў у тыдзень 2-3 гадзіны справе вывучэньня аўтамабіля.

Для прыкладу прыведу мегілеўскую ячэйку „Аўтадора" пры акрфінаддзеле.

У гэтай ячэйцы дзьве трэці членаў выпісваюць часопіс «За Руль».

Колькасьць выпісваемай часопісі дастаткова яскрава сьведчыць аб зацікаўленасьці работнікаў установы да пытаньняў, пастаўленых «Аўтадорам».

У ячэйцы «Аўтадору» пры Магілеўскім акрвыканкоме—члены ячэйкі самі падштурхвалі бюро арганізаваць гурток па вывучэньню аўтамабіля, але дзякуючы інэртнасьці бюро пакуль што гурток яшчэ не арганізован, хоць для гэтага і ёсьць спрыяючыя ўмовы.

Напаўна такое становішча і ў большасьці ячэек: маецца ў ячэйках значная колькасьць сяброў, якія-б стала



Пабудуем моцныя, прыгожыя масты

наведвалі гурток па вывучэньню аўтамашын, маецца машына, ёсьць шофэр, а часам і інжынэр—але няма каму запісаць жадаючых вывучаць машыну, няма каму склікаць сход, няма каму дагаварыцца з шофэрам (адзін з бюро ячэйкі надта заняты, другому няма часу, а трэці ад гэтым ня думае: яны нічога ня робяць).

Праходзіць дарэмна час, жывое імкненьне разьбівацца аб інэртнасьць бюро ячэек, і ня дзіва, калі пасьля гэтага чуеш:

«І нічога ваш „Аўтадор„ ня варт—толькі і знаеш, што плаці сяброўскія ўзносы».

Бюро ячэек «Аўтадору», а таксама і акруговым аддзяленьням трэба было-б сур'ёзна падумаць над практычнаю работаю гарадзкіх ячэек «Аўтадору», каб зрабіць іх пачатковаю школаю па вывучэньню машын.

А. Д.

Адчыняюцца курсы дарожных майстроў

Насельніцтва будуе і рамантуе дарогі сваімі сіламі і сродкамі ад самаабкладаньня. Натуральна, што такія дарогі, пабудаваныя бяз усякага тэхнічнага нагляду, праз вельмі кароткі час робяцца яшчэ горшымі, чымся былі да рамонту.

Тэхнічных сіл у нас вельмі мала. Дарожных дзесятнікаў не хапае нават для працы дзяржаўных органаў. Неабходна, каб у кожным, хоць-бы на першы час, раёне, быў-бы адзін дарожны майстар, пад загадам якога-б знаходзіліся-б масты, дарогі і шляхавыя пабудовы раёну.

Праўленьне беларускага таварыства „Аўтадор" «улічыла гэту акалічнасьць і 12-га сьнежня г. г. адчыняе ў Менску для Менскай, Бабруйскай і Аршанскай акруг—курсы па падрыхтоўцы дарожных майстроў.

Набор на курсы будзе праводзіцца райвыканкомамі і райённымі ячэйкамі «Аўтадору». Навучаньне—дарамовае. Будуць прымацца сяляне і рабочыя, прымаўшыя ўдзел у дарожных працах. Усяго на курсы на 3-х акругах будуць прыняты 52 чалавекі. Курсантам будуць выдавацца стыпэндыі ў разьмеры 15-20 руб. у месяц.

Такія-ж курсы адчыняюцца ў Віцебску 17-га сьнежня і ў бліжэйшы час у Мазыры.

Н. Г.

Будуем масты і грэблі.

(Барысаўшчына).

На шляхавае будаўніцтва асыгнавана па каштарысу 27-28 году 1.710 р., прынята па самаабкладаньню: грашыма—4744 руб., працай—4.183 руб., а ўсяго 10.637 руб.

Як гэтыя грошы скарыстаны?

Зроблена новых мастоў—74, даўжынёй 265 пагонных мэтраў і адрамантавана 12 старых, даўжынёй 65 паг. мэтраў.

Зроблены грэблі ў 4296 кв. мэтраў

Зусім не правялі працы па новаму будаўніцтву мастоў наступныя с.-саветы: Зембінскі с.-с. і местсавет, Корсакоўскі, Глінянскі, Аньдзяліцкі. Гэты сельсавет прыняў самаабкладаньня на 700 р. але-ж да гэтага часу не скарыстаў.

Лепш правялі працу Забашэўскі і Новасельскі сельсаветы.

Клябанаў.

За посьпех І-й аўта мабільнай лётарэі „Аўтадору".

Усяго толькі месяц прайшоў з часу атрыманьня лётарэйных білетаў 1-й аўталётарэі «Аўтадору» для Беларусі і ўжо відаць, наколькі лётарэя зацікавіла насельніцтва.

Паступаючыя кожны дзень грашовыя пераводы з самых глухіх куткоў Беларусі і патрабаваньні на білеты праўленьне «Аўтадору» здавальняе зараз-жа.

Вы можаце выйграць аўтамабіль, трактар, матацыклет, вэлясыпэд, аўтамабільнае падарожжа.

Набывайце білеты 1-й аўта-лётарэі. Білеты высылаюцца праўленьнем „Аўтадору" (Менск, Савецкая вул., № 82). Цана білета 50 кап. Для перасылкі білетаў да месца прызначэньня трэба далучаць 20 кап.

Бюджэт БССР на 12-м годзе Кастрычнікавае рэвалюцыі.

На ўмовах сацыялістычнай дзяржавы—бюджэт і эканоміка прадстаўляюць сабой непарыўнае цэлае, і таму вельга не затрымацца і не прасачыць разьвіцьця адной з частак беларускай гаспадаркі—яе дзяржаўнага пляну, якім зьяўляецца бюджэт, паказаўшы тыя асноўныя напрамкі, па якіх ідзе яго разьвіцьцё.

У першы год пасьля вызваленьня Беларусі ад белапалякаў (з 11 ліпеня да 31 сьнежня 1920 г.) нельга было думаць аб пабудове акрэсьленага пляну - бюджэту, калі былі важнейшыя пытаньні, як устанаўленьне і ўзмацненьне ўлады рабочых і сялян.

Толькі па 1921 г. удалося скласьці першы бюджэт БССР, але з дэфіцытам —у 92,6 проц., які быў пакрыты за рахунак эмісіі. Бюджэт 1922 году (за 9 м-цаў) быў першым арыентыровачным бюджэтам, складзеным на ўмовах новай эканамічнай палітыкі, калі галоўнай базай пабудовы яго ўжо зьявілася не эмісія, а падатковыя і неподатковыя даходы, і калі ўпяршыню з дзяржаўнага бюджэту быў выключаны і перададзены на мясцовы бюджэт шэраг выдаткаў, якія насілі мясцовы характар (утрыманьне нізавога савецкага апарату, камунальнай гаспадаркі і інш.). Ад гэтага году быў пакладзены пачатак і мясцоваму бюджэту БССР.

1922-23 і 1923-24 г. г. праходзілі пад знакам арганізацыі і далейшага ўзмацненьня фінансавай гаспадаркі, а разам з гэтым і асноў для пабудовы бюджэту, ажыцьцяўленьня розных мер па аздараўленьні фінансаў у напрамку —узмацненьня падатковага абкладаньня, выяўленьня і скарыстаньня дадатковых непадатковага характару, паступовай замены натуральных падаткаў грашовымі. Да гэтых часоў адносіцца выпуск чырвонца, які ў пачатку 1924 году цалкам замяніў сабой «савзнакі», стварыўшы цьвёрдую базу для складаньня як дзяржаўнага, так і мясцовага бюджэтаў.

Такім чынам, пачынаючы толькі з 1924-25 г., бюджэт БССР уступае на нармальны шлях свайго разьвіцьця, з якога часу прадстаўляецца магчымым дакладна прасачыць дынаміку яго і на падставе яе зрабіць адпаведныя вывады аб росьце эканамічных асноў для пабудовы бюджэту—народнай гаспадаркі і нацыянальнага даходу рэспублікі. У адзнаку ад першапачатковых бюджэтаў, якія, ва ўмовах няўстойлівай валюты, будаваліся, галоўным чынам, на падатках,—у бюджэце БССР, пачынаючы з 1924-25 г., побач са шпаркім ростам даходаў наогул, усё большае і большае значэньне набываюць непадатковыя даходы, што сьведчыць аб няўхільным і паступовым росьце нашай народнай гаспадаркі. Рост даходаў па дзяржаўным і мясцовых бюджэтах БССР на працягу пяці апошніх год характарызуецца наступнымі лічбамі (з вучотам за ранейшыя гады даходаў на Гомельшчыне):

Калі па дзяржаўным бюджэце—брутто (ня лічачы адлічэньняў ад агульнасаюзнага паступленьня гэрбавага збору) фактычна паступіла даходаў у 1924-25 г. 25,42 міліёна руб., дык на 1928-29 г., паводле папярэдніх даных, прадугледжана 68,24 міл. руб., што дае рост, у параўнаньні з 1924-25 г., на 42,82 м. руб., або 168,4 пр.

Па мясцовых бюджэтах уласныя даходы ў 1924-25 г. фактычна склалі 19,75 міл. руб.; на 1928-29 г. паступленьне іх намячаецца ў 46,19 міл. руб.—павялічэньне адносна 1924-25 г. на 26,44 міл. руб., ці на 133,9 проц.

Трэба адзначыць, што на працягу усяго гэтага пэрыяду назіраецца наогул кожны год значны прырост паступленьня даходаў як па дзяржаўным, так і па мясцовых бюджэтах БССР, прычым найбольшы рост іх меў месца да 1926-27 г. (у 1925-26 г. максымальны рост даходаў вызначыўся на 61,1 проц. па дзяржаўным і на 42,8 проц.—па мясцовых бюджэтах). Пачынаючы ад 1926-27 году тэмп росту робіцца больш павольным, бо да гэтага часу ўжо ўцягваюцца ў эксплёатацыю амаль што ў поўнай меры ўсе непадатковыя даходныя крыніцы (лясны даход, прамысловасьць, гандаль і інш.). Адносна росту непадатковых даходаў трэба сказаць, што параўнаньне іх з падатковымі даходамі за гэты-ж пэрыяд па дзяржаўным бюджэце дае наступны малюнак: у той час, як непадатковыя даходы ў 1924-25 г. складаюць толькі 7,72 міл. руб., або 30,4 проц. усіх даходаў, а падатковыя—17,70 міл. руб., або 69,6 проц., дык ужо ў 1925-26 г. роля непадатковых даходаў у дзяржаўным бюджэце рэзка мяняецца і яны складаюць 25,15 міл. руб., або 61,4 проц., а падатковыя толькі 15,81 міл. руб., або 38,6 проц. усіх даходаў. У наступныя гады ўдзельная вага тых і другіх даходаў менш-больш стабілізуецца на адным і тым-жа ўзроўні, прычым у 1927-28 г. 59 проц. усіх рэспубліканскіх даходаў даюць непадатковыя і 41 проц.—падатковыя даходы. На 1928-29 г. значна падымаецца ўдзельная вага падатковых даходаў—да 52,4 проц., з прычыны зьмены заканадаўства па прамысловым падатку.

Што датычыцца напрамку выдатковай часткі дзяржаўнага і мясцовых бюджэтаў, дык патрэбна адзначыць, што ў першы пэрыяд пабудовы бюджэтаў асноўнае месца ў іх займалі адміністрацыйныя выдаткі. З адчаўленьнем і ўмацаваньнем нашых фінансаў і ўступленьнем народнай гаспадаркі БССР на шлях мірнага будаўніцтва і індустрыялізацыі краю — мяняецца структура і абхват выдатковых частак дзяржаўнага і мясцовых бюджэтаў. Разам з гэтым назіраецца значны рост бюджэтаў у абсалютных лічбах.

Баланс дзяржаўнага бюджэту ў 1924-25 г. па фактычным выкананьні складае 22,95 міл. руб., а на 1928-29 г. ён намячаецца ў 85,96 міл. руб. Такім чынам, выдатковая частка дзяржаўнага бюджэту БССР ад 1924-25 г. да 1928-29 г. павялічваецца на 63,01 міл. руб., або на 274,5 проц.

Адносна мясцовых бюджэтаў трэба заўважыць, што ў той час, як выдаткі іх у 1924-25 г. складалі 21,59 міл. руб., дык ужо на 1928-29 г. яны намячаюцца, паводле папярэдніх даных, у суме 50,91 міл. руб., з ростам супроць 1924-25 г. на 29,32 міл. р., або на 135,8 проц. Баланс бюджэтаў, асабліва дзяржаўнага, бурна ўзрастаў да 1926-27 г., ад якога году пачынаецца больш павольны тэмп разьвіцьця іх, галоўным чынам, з прычыны заканчэньня шпаркага працэсу адчаўленьня нашае разбуранае народнае гаспадаркі і пераходу яе на шлях паступовае рэканструкцыі.

Побач са штагодніх значным ростам бюджэтаў БССР—з кожным годам, пры зьніжэньні ўдзельнае вагі адміністрацыйных выдаткаў на утрыманьне дзяржаўнага апарату, павялічваюцца асыгнаваньні на народную гаспадарку, сацыяльна-культурныя патрэбы і на ўсё тое, што зьвязана з падняцьцем дабрабыту працоўных мас рэспублікі. Аб гэтым яскрава сьведчаць лічбы наступнай табліцы:

ВІДЫ ВЫДАТКАЎ.	ПА ПРЫЗНАЧЭНЬНІ.				Удзельная вага ў бюдж.	1928—1929 год.	% росту.	Удзельная вага ў бюдж.
	1926—1927	Удзельная вага ў бюдж.	1927—1928	% росту.				
	(У мільёнах рублёў).							
1. Выдаткі на народную гаспадарку . .	14,99	29,2	19,09	27,4	32,0	29.71	55,6	34,5
2. Сацыяльна-культурныя патрэбы . . .	10,33	20,1	12,91	24,9	21,6	16,64	28,9	19,3
3. Дзяржаўнае кіраўніцтва	4,02	7,8	3,43	—14,7	5,7	3,57	4,0	4,1

Такім чынам, мы бачым, як адначасова з узмацненьнем фінансавай сыстэмы і шпаркім адчаўленьнем народнай гаспадаркі БССР, паступова, з году ў год, растуць наш дзяржаўны і мясцовыя бюджэты, і за мінулы час мірнага будаўніцтва БССР мы ў гэтым сэнсе пашлі далёка наперад.

На 12 годзе Кастрычнікавае рэвалюцыі дзяржаўны і мясцовыя бюджэты маюць трывалы фундамант для свайго далейшага разьвіцьця і перабудовы на вышэйшай тэхнічнай аснове нашай народнай гаспадаркі, якая ўжо ў сваім поступе перасягнула даваенны пэрыяд. Усё гэта кажа за тое, што матар'яльная база, якая была закладзена ў гістарычныя Кастрычнікавыя дні, з кожным годам павялічваецца і вязе да завяршэньня будаўніцтва сацыялізму.

Л. Заяц і Ўл. Дрывоцікаў.

Пабудуем свае курорты.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам старшыня камісіі па вывучэнню вытворчых сіл Беларусі д-р Трамповіч паведаміў наступнае аб стане курортнай справы ў БССР.

— Мы можам сказаць з упэўненасцю, што вельмі рэдка хто з нас ведае аб тым, што ў нас, у БССР, пад бокам ёсьць свае уласныя зрэўніцы, свае курорты. Кожную вясну людзі накіроўваюцца ў Крым, на Каўказ і ў іншыя курортныя месцы Савецкага Саюзу, трацячы на гэта ўсе свае скупыя зьберажэньні. Усе, хто толькі мае магчымасьць, імкнецца пасхаць на курорт, каб паправіць сваё здароўе.

Тым часам, калі мы, беларусы, не знаёмы з сваімі курортамі, то з імі больш знаёмы людзі з іншых савецкіх рэспублік. Кожную вясну і лета можна спаткаць у Чашніках і Баркаўшчыне шмат пацыентаў, якіх накіроўваюць сюды ленінградзкія дактары, мы-ж шукаем паправкі далёка ад БССР. У Чашніках, Баркаўшчыне і Лагойску ёсьць лекавыя крыніцы, якія могуць абслужыць усіх, каму толькі патрабуецца курортнае лячэньне, у гэтых месцах могуць быць арганізаваны гразявыя ванны, як горныя адсекіх і інш. Хімічны аналіз беларускай лекавай гразі паказвае, што іх толькі трэба пазначна апрацаваць салявой кваснасьцю, і яны ня будуць уступаць лепшым гразявым курортам Савецкага Саюзу.

Трэба яшчэ спыніцца і на тым, што арганізацыя курортаў на тэрыторыі БССР мае надзвычайна вялікае значэньне ня толькі па сваёй таннасьці, але яшчэ і таму, што лячэньне хворых на сухоты лепш праходзіць на месцы і дае больш карысныя вынікі.

Да рэчы трэба адзначыць, што беларускія курорты маглі-б замяніць, выбуўшыя з карыстаньня фінляндзкія курорты, якія ў даваенны час абслугоўвалі трэцюю частку ўсіх курортнікаў былой Расеі. Але перад Фінляндыяй мы маем тую перавагу, што ў нас курортны сезон больш доўгі, больш сонечных дзён і больш высокая сярэдняя тэмпэратура. Што-ж датычыцца прыгожых краявідаў, то ў Полаччыне ёсьць такія месцы, якія па уступяць па сваёй прыгожасьці фінляндзкай прыродзе.

У сучасны момант у Баркаўшчызьне будуецца санаторы на 50 хворых. Зразумела, што гэта толькі пачатак. Мы павінны шырока разгарнуць курортнае будаўніцтва ў межах БССР, каб даць магчымасьць працоўным тапна і добра паправіць сваё здароўе. Калі-б мы належна разгарнулі курортнае будаўніцтва, можна было-б значна павялічыць курортнае абслугоўваньне хворых розных катэгорый.

Адначасна з гэтым мы намецілі працягваць справу па дасьледваньню і вывучэньню нашых курортаў. У наступнае лета камісія па вывучэньню вытворчых сіл Беларусі пры Аддзеле Прыроды і Гаспадаркі Беларускай Акадэміі Навук паставіла сабе задачу заняцца вывучэньнем курортных месц у паўднёвай частцы БССР, дзе па поўных меркаваньнях ёсьць лекавыя крыніцы і лекавыя гразі, у прыватнасьці па р. Сожу.

Вынікі 2-й усебеларускай нарады працаўнікоў ашчаднай справы.

Нядаўна адбылася нарада працаўнікоў ашчаднай справы.

Цэнтрам увагі нарады было пытаньне аб становішчы працы на вёсцы і мерапрыёмствах у галіне яе ўзмацненьня.

Нарада канстатавала некаторыя дасягненьні ў гэтай галіне, але адзначыла, што дасягнутыя вынікі ня ўяўляюць вельмі незадвальняючымі і далёка не адпавядаючымі росту прыбытковасьці сельскай гаспадаркі.

Нарада паставіла асноўнай задачай у далейшай працы ашчадных кас — узмацненьне працы на вёсцы, для чаго прызнала неабходным шырай увагнуць у яе васковы актыў і мясковых культурных працаўнікоў.

Далей нарада, канстатуючы слабую дзейнасьць камісій садзейнічаньня ашчаднай справе ў райёнах і сельсаветах, паставіла прыняць энэргічныя меры да ажыўленьня іх працы і адначасова прызнала неабходным пашырыць межы працы гэтых камісій у напрамку вядзеньня, імі апрача агітацыі, таксама і практычнай працы па ўпягненьню новых укладчыкаў.

Пры абмеркаваньні становішча ашчаднай справы ў горадзе, нарада канстатавала значны рост укладчыкаў за 1927-28 г., але ўсё-ж гэты рост далёка недастатковы (ахоп 23,5 проц. сяброў саюзу і зусім незначны ахоп незарганізаванага насельніцтва).

Аналізуючы працу кас, якія знаходзяцца пры асобных прадпрыёмствах і ўстановах, нарада прызнала работу гэтых кас недастатковай.

Асноўнай прычынай гэтага нарада прызнала адсутнасьць сувязі ашчадкасы з мясцовымі праф. і партчэйкай, адсутнасьць увагі з боку адміністрацыі прадпрыёмстваў да працы ашчадкасы.

Выходзячы з гэтага, нарада прызнала неабходным пераглядзець супольна з адміністрацыяй і грамадзкімі арганізацыямі прадпрыёмстваў склад выдучаных для ашчаднай працы працаўнікоў і замяніць іх у неабходных выпадках адпаведнымі асобамі.

Для ўзмацненьня ідэй ашчаднасьці ў шырокія колы насельніцтва нарада прызнала неабходным скарыстаць школы, шляхам арганізацыі ў іх «кутку ашчаднасьці», увядзеньня ў школьным заняткі «гадзіны беражлівасьці» і г. д.

Адзначыўшы слабую працу кас пры вайсковых часьцях, нарада пастанавіла прыняць меры да ўзмацненьня працы сярод вайсковых частак.

Абгаварваючы пытаньне аб агітацыі і прапагандзе, нарада прызнала неабходным больш асьвятляць у друку працу ашчадкас, шырока скарыстаць насьценгазэты для папулярызацыі ашчаднай справы, прыцягнуць да асьвятленьня і папулярызацыі ашчаднай справы рабселькораў, стварыць сталы кадр агітатараў па ашчаднай справе. Усю агіт.-прапагандысцкую працу нарада прызнала неабходным праводзіць па пляну, які павінен быць узгоднен з мясцовымі партыйнымі і прафесыянальнымі органамі.

Усе прынятыя нарадай рашэньні павінны быць падрабязна прапрацаваны на мясцох і праведены ў жыцьцё.

Агульнымі натугамі ашчаднага апарату і савецкай грамадзкасьці ашчалкасы выкаваць той плян і рашэньні, якія 2-я ўсебеларуская нарада працаўнікоў ашчаднай справы прыняла і павялічыць упягваемыя імі сродкі на патрэбы індустрыялізацыі.

Палеес.

ХРОНІКА.

На будаўніцтве менскага трамваю.

У сувязі з наступленьнем зімы, усе работы па пракладцы трамвайных рэек спыніліся. Зараз ідуць работы па тэрмітавай спайцы рэек. Гэтыя работы працягнуцца да таго часу, пакуль будуць атрымоўвацца матар'ялы. Наогул узяты курс на тое, каб за зімовы пэрыяд скончыць спайку рэек, што дасьць магчымасьць з вясны распачаць шпаркім тэмпам будаўніцтва.

У час зімы будуць таксама весьціся работы па загатоўцы матар'ялаў і здачы ўсіх заказаў на ўсё трамвайнае абсталяваньне. Будзе таксама ўзімку пабудаваны для трамваю мост праз р. Свіслач на вуліцы Бакуніна.

У бліжэйшы час распачынацца работы па будаўніцтву электрычнай падстанцыі на тэрыторыі «Эльводу». Для падстанцыі абсталяваньне ўжо заказана ў Аўстрыі.

Менскі дзень.

Курсы краязнаўства адчыніць цэнтральнае праўленьне саюзу Савгандальслужачых для саюзнага актыву. На ўтрыманьне курсаў адпушчаны адпаведныя сродкі.

15 ліквпунктаў арганізаваў саюз будаўнікоў у Менску для абслугоўваньня членаў саюзу. Гэтымі ліквпунктамі ахоплена да 200 будаўнікоў.

На 2000 руб. закупіла ЦП саюзу будаўнікоў зімовага спартыўнага інвэнтару. Паміж іншым набыты 100 пар лыж для наладжаньня масавых прагулак за горад.

1850 тон льносемя загатоўлена ў лістападзе месяцы па БССР. Загатоўкі праходзяць здавальняюча.

Калегія НК РСІ задаволіла хадайніцтва Беларускага саматажна-прамысловага саюзу і дазволіла аднаму адчыніць сваё представіцтва ў Маскве.

1600 руб. адпусціў Савнарком БССР Цэнтральнай Статыстычнай Управе БССР на абсьледваньне месячных бюджэтаў 50 рабочых і 30 служачых.

825 тон яньні выдзеліў саматужны камітэт ВСНГ СССР для саматужнай каапэрацыі БССР на бягучы 1928-29 гаспадарчы год. Вызначаная колькасьць яньні пойдзе для здавальненьня саматужных арцеляў.

175 вагонаў вотрубей будзе завезена ў БССР у сьнежні месяці. Гэта колькасьць вотрубей пойдзе для забясьпечаньня малочных арцеляў.

19.000 руб. разьмеркавала ЦП саюзу паперніку на надвышэньне зарплаты адсталым групам рабочых пашыровай прамысловасьці БССР.

Да 10-годзьдзя БССР.

Дзіцячы ачаг Менскага ЦРК да сьвяткаваньня 10-годзьдзя арганізаваньня БССР будзе пашыраны з 40 да 60 дзяцей. Ачаг абслугоўвае выключна дзяцей пайшчыкаў Менскага ЦРК. Адбор дзяцей у дзіцячы ачаг праводзіць кваэрацыйная камісія. Трэба адзначыць, што ў адносінах харчаваньня дзяцей ачаг МЦРК займае ў Менску першае месца. У дзіцячым ачагу выхоўваюцца ў большасьці дзеці пайшчыкаў рабочых і работніц.

Падрыхтоўка саюзаў да перавыбараў саветаў.

Цэнтральнае праўленьне саюзу швейнікаў выдзеліла 10 рабочых з фабрыкі «Меншвой» для правядзеньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі на вёсцы.

На гэтую-ж працу ЦП саюзу будаўнікоў выдзеліла 6 рабочых.

Яшчэ 1 вячэрні рабфак.

Наркамасьветы пастанавіў арганізаваць у г. Барысаве вячэрні рабфак. Прыём на рабфак будзе праводзіцца без камандыровак і сёлета будзе прынята 80 чалавек. НКА даў указаньне шырока папулярызаваць рабфак сярод рабочых г. Барысава. Куро рабфаку разлічаны на 5 гадоў. Прыём заву на рабфак скончыцца да 25 сьнежня і з гэтага дню будуць праводзіцца іспыты. Заняткі на рабфаку пачнуцца з 2 студзеня 1929 г.

Падарожжа вакол сьвету.

У Менск прыехаў амэрыканскі падарожнік Пешка. Апошні падзеен быў абыйсьці і аб'ехаць на працягу 4 год усе краіны сьвету. Падарожнік Пешка зрабіў гэтае падарожжа вакол сьвету раней вызначанага тэрміну. У апошні час ён знаходзіўся ў Сібіры і Манчжуры. Зараз ён ужо скончыў сваё падарожжа і едзе праз Менск —Варшаву у Амэрыку. За гэтае падарожжа ён атрымоўвае 10.000 даляраў.

Прапрацоўка пытаньняў IV дашкольнага зьезду.

У працы IV дашкольнага зьезду ў Маскве прымала ўдзел 42 делегаты ад БССР. Представнік беларускай делегацыі на зьезьдзе зрабіў сакладад аб праграме нулявой групы.

Зараз дашкольныя працаўнікі Менску пачынаюць распрацоўку пытаньняў, якія разгледжаны IV дашкольным зьездам; будуць запрошаны і працаўнікі з райёнаў Меншчыны. Тое-ж самае маркуецца правесьці і на ўсіх акругах БССР.

Абслугоўваньне беспрацоўных будаўнікоў.

Для абслугоўваньня беспрацоўных членаў саюзу будаўнікоў менскі клюб апошніх зараз працуе і дзень. Прызначаны спэцыяльны кіраўнік, у клюбе працуюць розныя гурткі і праводзіцца гучная чытка газэт. Раз у месяц для беспрацоўных ставяцца спэктаклі, або даюцца кіно-сэансы. Для рабочых нагельных заводаў № 1 і 2 арганізуюцца два ліквпункты, якія ахопяць да 40 чалавек. У бліжэйшым часе на сходах беспрацоўных распачнецца прапрацоўка ўсіх пляноў і праграм будаўніцтва сэзону 1929 году.

Курсы каапактыву МЦРК.

У сучасны момант пры праўленьні Менскага ЦРК працуюць курсы каапэрацыйнага актыву. Курсы наведвае акуратна 50 чалавек—сяброў крамных камісій і наогул каапактыву. Праграма курсаў разлічана на 5 месяцаў.

Дапамога інвалідам.

Менская акруговая інспэкцыя сацыяльнай забясьпекі адчыніла 25 каркоў.

У карках будуць працаваць выключна тыя інваліды, якія ня могуць працаваць на вытворчасьці.

„Элісо".

(КІНО «КУЛЬТУРА»).

Дзяржкіно Грузіі рабіла гэтым фільмам спробу паказаць прыгнечаньне грузінаў, якое панавала ў Цэрскай вобласьці у пачатку другой паловы XIX стагодзьдзя, калі там сядзеў царскі слуга—генэрал Лорыс-Мэлікаў.

Нажаль, гэта спроба аставася толькі спробаю. Быт, вопраткі, узаемныя стасункі грузінаў не пераносяць нас у XIX стагодзьдзе, хіба толькі тыя генэрала Лорыс-Мэлікава адзяваньне эпосе. Аднак, і ў адносіне да яго зусім непатрэбная шаржыроўка, якая ў значнай меры зьмяншае эфэкт усяе стужкі.

Карыкатурныя вобразы ў фільму не стараюць для яго дадатных бакоў, нэгадзірог —перарабляюць у байку, прыдаюць казачны характар. Вера ў тое, што так было сапраўды—гіне бясьсьледна. Прыкладам можа служыць сцэна змаганьня Вакула з генэральскімі прыслужнікамі. Мы ахвотна верым, што ў горах сарэтны і моцны Вакул лёгка пераможа 10 добра ўзброеных царскіх афіцэраў, але ніяк ня верыцца, што гэта яму ўдасцца зрабіць у габіцэне Лорыс-Мэлікава.

Прымусовае высяленьне грузінаў з родных аулаў у «сінюю даляніну» Турцыю падаецца зусім бледна. Ня відаць тэй вялікай сацыяльнай драмы, якая павінна быць у такіх выпадках.

Рамантыкам Вакула і Элісо слаба ўязан з агульнымі пазэсіямі.

Дарэчы, ніяка сабе ўявіць, чаму фільм называецца «Элісо». Хіба толькі таму, што «Элісо», выконваючы жадальне бацькі, падпаліла выселены аул, ды адмовілася пакінуць бацьку, не пашоўшы з каханым Вакулам.

Зразумела, фільм мае добрыя бакі: ён знаёміць з чароўнаю прыродаю Каўказу, якая надрэнна сфатаграфавана; яскрава паказвае цікавыя каўкаскія тыпы, знаёмячы з іх ідэялёгіяй.

Але ўсё гэта мае толькі этнаграфічную каштоўнасьць.

С. АЗ.

Да юбілею Цішкі Гартнага.

Аб'яднаньне пісьменьнікаў „Полымя" наладжвае 15-га сьнежня ў Доме Асьветы літаратурны вечар, ПРЫСЬВЕЧАНЫ 20 ЦІГАДОВАМУ ЮБІЛЕЮ ЦІШКІ ГАРТНАГА. У праграме вечара—даклад аб творчасьці Цішкі Гартнага, успаміны і прысьвячэньні юбіляру і канцэрт.

Напярэдадні 3-й усебеларускай мастацкай выстаўкі.

11-га сьнежня адбылося першае пасяджэньне камітэту 3-й усебеларускай мастацкай выстаўкі. Старшынёй камітэту абран М. Грамыка. Выстаўку пастановлена адчыніць 1-га студзеня ў Доме Селяніна альбо ў Камвузе. Аб'яднаньне „Прамень" будзе представлена на выстаўцы асобным аддзелам, галоўным чынам, канструкцыйна-мастацкімі працамі.

Выстаўка працягнецца 3 тыдні. Экспанаты на выстаўку будуць прымацца да 25 га сьнежня. Ужо пачалі паступаць першыя партыі экспанатаў.

Падарункі інвалідам у сьвята 10-цігодзьдзя БССР.

Для адзначэньня сьвята 10-цігодзьдзя арганізаваньня БССР, Нар. Кам. Сацыяльнай Забясьпекі адпусціла 8.000 руб. З гэтых сродкаў адпушчана Менскаму акруговаму інспэктарыяту сацыяльнай забясьпекі, Аршанскаму, Віцебскаму і Гомельскаму па 1.000 руб., Полацкаму і Мазырскаму па 800 руб. і Бабруйскаму і Магілеўскаму па 1.200 руб.

Гэтыя сродкі пойдуць на каапэраваньне і падпісаньне падарункаў гаспадарчага значэньня (сельска-гаспадарчы інвэнтар і г. д.) інвалідам грамадзянскай вайны і былым чырвоным партызанам.

Вывучэньне летапісных славянскіх пляменьняў.

Этнограф Сэрбаў зараз працуе над вывучэньнем гістарычнай мяжы паміж летапіснымі славянскімі пляменьнямі радзімічаў, дрыгвічоў і крывічоў. Па археалёгічных дасьледах і этнаграфічных назіраньнях мяжа гэта ўжо ўстаноўлена ад Быхава па р. Дняпру, па рацэ Ухлясьні, балоту Чыстыя Лужы, да стоку р. р. Проці з Сожам, а затым па р. Проці да яе вытокаў каля в. Дабрынь, Аршанскай акругі. На ўсходзе ад гэтае мяжы яскрава выступаюць сьляды культуры радзімічаў, а на захад—дрыгвічоў.

У Дубровенскім р., Аршанскай акругі, мінулым летам экспедыцыя ЦБ краязнаўства ўстанавіла стык гэтых пляменьняў, але з поўнаю паміж радзімічамі і дрыгвічамі ўклініваюцца смаленскія крывічы.

Адзіякі культуры радзімічаў вельмі добра захаваліся там у в. в. Пічанька і Жорнаўка, а жыхары іх носяць агульную назву «Гарчан». Дрыгвічы выступаюць з сваёй культурай на захад ад Дабрыні ў напрамку да Ворты. Культура крывічоў заметна па напрамку на м. Леніна (раней Раманава) і далей на Смаленск.

Археалёгіч[illegible] дасьледваньні паказалі асаблівасьці [illegible] захаваньня радзімічаў, а таксама асаблівасьці розных часаў убраньня. Прыкладна, радзімічы з старадаўніх часоў любілі насіць вялікія завушніцы і розныя прывескі.

У дрыгвічоў старажытная культура мае таксама свае асаблівасьці, што можна бачыць з раскопак [illegible] Менску.

Этнаграфічныя назіраньні гадоў 30-[illegible] таму назад паказвалі асаблівасьці матар'яльнай культуры, пераважна ў вопратцы і галаўных уборах. Дрыгвічы насілі вязку магерку, а радзімічы—высокую шапку-валёнку, таксама была розьніца ў способах завязкі хустак у дрыгвічаў: хусткі пераважна завязваліся з вялікімі рагамі, а ў радзімічаў—з меншымі ці зусім кругла.

У крывічоў як полацкіх, так і смаленскіх былі свае асаблівасьці ў вопратцы і галаўных уборах. У іх пераважна ўжываліся белыя палатняныя насовы, на падабенства белай сьвіткі, а хусткі завязваліся ў большасьці кругла.

Асінаўскае балота, як відаць, паслужыла ў свой час мяжой паміж радзімічамі, дрыгвічамі і крывічамі.

Суд.

РАСТРАТЧЫК СА СТАЖАМ.

Наум Майсеяў Нахумаў у даваеннымы час меў у г. Менску ўласную друкарню. Жылося Нахумаву добра—ня кажаў бы ніякай справаздачы і ні перад кім не адчываўся.

Пасьля Кастрычніцкага перавароту жыцьцё Нахумава змянілася ўласнай друкарні няма і сродкі к жыцьцю трэба здабываць уласным гарбом.

Працуючы некаторы час на сродкі жыцьця раней, Нахумаў пачаў шукаць працу і, як свед, хутка атрымаў пасаду ўпаўнаважанага друкарні Беларускай вайсковай акругі. На гэтай пасадзе Нахумаў працаваў да ліквідацыі друкарні.

Як упаўнаважаны, Нахумаў меў справу з грашыма, атрымліваў ад заказчыкаў грошы, якія павінен быў здаваць в прадстаўленьнем грашовай справаздачы, але Нахумаў грашовых запісаў не рабіў, справаздачы не складаў, а грошы за заказы проста клаў у кішэні і лічыў, што ён гаспадар друкарні.

Пасьля ліквідацыі друкарні ў кішэні Нахумава так і засталося 2525 р. 95 к. Перайшоўшы на пасаду ў друкарню імя «Сьмірнова» ў г. Смаленску і выконваючы абавязкі таксама ўпаўнаважанага, Нахумаў такім-жа шляхам і там растраціў 324 р. 69 кап. Акрамя паказаных сум Нахумаў не адчыўся за авансам.

У часе папрадняга сьледства ў пракуратуру Менскаргі ад даяржаўнай друкарні „Саха і Молат" у г. Магілеве паступіла заява, у якой друкарня піша, што Нахумаў не адчыўся за заказы на суму 729 р. 5 к. і просіць прыцягнуць Нахумава да адказнасьці, як растратчыка.

На судзе факт растраты па першых двух друкарнях пацьвердзіўся, а адносна растраты 722 р. 5 к. на друкарні «Саха і Молат» справа не дасьледавана.

Менскі Акруговы суд, разгледзіўшы справу, на аснове 1 ч. 113 арт. К. К., прыгаварыў Наума Майсеява Нахумава на тры гады пазбаўленьня, з пазбаўленьнем у правах на 40 арт. Кр. К. на два гады на адбыцьці пакараньня.

На аснове 327 арт. Кр. П. К. суд зладовіў грамадзянскі іск і прысудзіў з Нахумава на карысьць кіраўніцтва Беларускай вайсковай акругі 3570 р. і на карысьць друкарні імя «Сьмірнова» 324 р.

Амністыя да Нахума, як да злоснага растратчыка, не дастасавана.

Сарава адносна растраты Нахумавым 729 р. 5 к. па друкарні «Саха і Молат» выдучана і накіравана Магілеўскаму прокурору для сьледства.

К.

Паштовая скрынка.

Міхасю з Барысава.—„Дзе вочы РВК"—перадана ў Менскую акр. РСІ.

„Пяючы". „Гаспадар-цар-бацюшка"—туды-ж.

Адамовічу С. „Аб шўцой" друкавацца ня будзе. Раз не даваляюць адчыняць, дык і добра.

Сьвінабоку С. М. У адказ на ваша запытаньне ЦБ Пралетстуду паведамляе, што пры ўмовах агульнага недахопу стыпэндый, якімі ў сярэдніх забясьпечана да 50 проц. студэнтаў па БССР, стыпэндыі выдаюцца ў першую чаргу рабочым і іх дзецям, сялянам, батракам, беднякам, часткова серадняком і зусім у малым ліку служачым. Паколькі процант забясьпечаньня ня можа абхапіць памянёныя групы, ЦБ Пралетстуду лічыць правіцьлым пастанову С.-Г. Акадэміі, якая вам адмовіла ў стыпэндыі, як сыну былога стражніка.

Будзіну «Аб рабоце пазамежных саветаў БССР» было вымешчана ў дадатку № 4 „Саветы Беларусі". Гэтага-ж другі раз зьмяшчаць у газэце няма сэнсу.

Аповяшчэньні.

У нядзелю 16-12, а 2 гадзіне дня, у памяшканьні Фрунзаўскага РК ЛКСМБ адбудзецца нарада сэкратароў ячэек ЛКСМБ і шэфпрацаўжікоў членаў бюро юнсэкцый, шэфт-ва і камсамольцаў, вылучаных ячэйкамі для шэфпрацы, па пытаньню задачы шэфпрацы ў зьвязку з перавыбарамі с.-саветаў.

Сёньня, а 7-ай гадзіне ўвечары, у малой залі клюбу К. Маркса адбудзецца агульны сход жэнскай філіі Белар. Асацыяцыі Пралетарскіх Пісьменьнікаў.

На нараду дню:
1. Выбары зьезду і чарговыя задачы.
2. Выбары бюро філіі.

Прысутнасьць сяброў асацыяцыі абавязкова.

увход вольны.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР

Чацьвер, 13 сьнежня,

„ЗАПЯЮЦЬ ВЕРАЦЁНЫ"

Саюзу Працасьветы.

Пачатак роўна а 8 гадзіне ўвечары.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». БАЯВІК СЭЗОНУ „ЭЛІСО". Пачатак 1-га сэансу а 7 гадзіне.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". З аўторка, 11 сьнежня „ІЛОНА". Звыш праграмы: 2-гі тыдзень гастроляў сатырыка С. ВРОНСКАГА.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». З аўторка, 11 сьнежня „ЖОНКА САБЕІДА".

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР «ЮНЫ ПІАНЭР». Гістарычны фільм „КАНЕЦ ДЫНАСТЫІ РАМАНАВЫХ". Звыш праграмы: культфільм «ВОЛХАЎБУД»

АБАВЯЗКОВА РЭГІСТРАВАЦЬ ДА-ШКОЛЬНЫЯ ГРУПЫ.

Менскі Акруговы Інспэктарыят Народнае Асьветы, на аснове абавязковае пастановы Менскага Гарсавету ад 8-II 28 г. за № 7, прапануе ўсім грамадзкім арганізацыям і прыватным асобам г. Менску зарэгістраваць у Інспэктарыяце (Пляц Волі, дом № 4) усе адчыненыя імі дашкольныя групы незалежна ад ліку дзяцей, якія ў іх знаходзяцца.

Інспэктарыят Нарасьветы.

УПАЎНАВАЖАНЫЯ МЯСЦКОМАЎ ПРАЦАСЬВЕТЫ!

СЬПЯШАЙЦЕСЯ ПРЫСЛАЦЬ ПАДПІСКУ НА

КОНКУРС

ЗАСТАЛОСЯ ЎСЯГО ДВА ТЫДНІ.

УСЯ ПРЫСЛАНАЯ ПАДПІСКА ЗАЛІЧАЕЦЦА НА КОНКУРС

ПЕРШАЯ ПРЭМІЯ — 165 РУБЛЁЎ. —

ЛІК ПРЭМІЙ НЕ АБМЕЖАВАНЫ.

АДКРЫТА ПАДПІСКА НА 1929 ГОД НА ШТОДЗЁННУЮ ЦЭНТРАЛЬНУЮ БЕЛАРУСКУЮ ГАЗЭТУ

„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ",

орган ЦВК Беларусі

БЕСПЛАТНА 3 білеты гадавым падпісчыкам

ЛЁТАРЭЯ

15 студзеня 1929 г.

БЕСПЛАТНА 1 білет паўгадавым падпісчыкам

Будзе разыграна 50 каштоўных рэчаў.

У ЛЁТАРЭІ БУДУЦЬ УДЗЕЛЬНІЧАЦЬ ТОЛЬКІ ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ ПАДПІСЧЫКІ.

ЛЁТАРЭЙНЫЯ БІЛЕТЫ ВЫСЫЛАЮЦЦА ПА АТРЫМАНЬНІ КВІТКА АБ ЗДАЧЫ ПАДПІСКІ.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА:

УПАЎНАВАЖАНЫМІ ГАЗЭТЫ, УСІМІ ПАШТОВА-ТЭЛЕГРАФНЫМІ АДДЗЯЛЕНЬНЯМІ, КОНТРАГЭНТАМІ, АГЭНТАМІ І АДДЗЯЛЕНЬНЯМІ «ИЗВЕСТИЙ ЦИК СССР».

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

на год—8 руб., на 6 мес.—4 руб., на 1 мес.—90 кап.